№№27—28
(2547—2548)

16 лютага 2007 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная воля».
Кошт — свабодны.

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...
Якуб КОЛАС

Да ўвагі!

Хто не зрабіў перадаплату і хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

Наведвайце сайт «Народнай волі»!

Паважаныя чытачы "Народнай волі"!

Знайсці нас у Інтэрнеце можна па адрасе **www.nv-online.info**

Там вы зможаце прачытаць артыкулы апошніх нумароў газеты і абмеркаваць іх, даведацца пра падзеі ў краіне і свеце на стужцы навін, напісаць электронны ліст у рэдакцыю.

Архіў газеты можна паглядзець па адрасе **http://nv.promedia.by**

ЗВАРОТ

Кіраўніку Рэспублікі Беларусь А.Р.Лукашэнку

Паважаны Аляксандр Рыгоравіч!

Мне нялёгка звяртацца да вас, аднак я разумею, што не маю права не выкарыстаць усіх магчымасцяў дзеля будучыні нашай Беларусі. Згодны з вашым меркаваннем, што становішча спраў у эканоміцы можа стаць катастрафічным. Гэтага нельга дапусціць.

Вы ўвесь час падкрэсліваеце, што асноўнай мэтай вашай палітыкі з'яўляюцца захаванне суверэнітэта краіны і забеспячэнне дабрабыту народа. Для дэмакратычных сіл гэта таксама галоўная задача.

Спадзяюся, што вы былі шчырым, калі казалі пра важнасць развіцця добрых стасункаў з Еўропай. Многія беларусы заўважылі вашае выказванне пра неабходнасць другога, еўрапейскага, крыла дзеля нармальнага развіцця Беларусі. Я перакананы, што гэтага можна дасягнуць у найбліжэйшыя тэрміны. Умовы развіцця супрацоўніцтва з аб'яднанай Еўропай добра вядомыя, яны выкладзеныя ў прапановах кіраўніцтва Еўрасаюза, скіраваных ураду і народу Беларусі.

Перакананы, што адстойваючы еўрапейскі выбар для Беларусі, мы робім слушна. Але я таксама перакананы, што працяг канфрантацыі ўнутры краіны не пойдзе на карысць беларускаму народу. Ведаю, што, нягледзячы на рознагалоссі, можна дасягнуць выніку, калі галоўнай нашай мэтай будзе захаванне незалежнасці Беларусі і паляпшэнне жыцця народа.

Сёння як ніколі востра паўстала пытанне пра будучыню нашай дзяржавы. Выклікі сучаснага свету — энергетычныя, дэмаграфічныя, экалагічныя, гуманітарныя — наўпрост тычацца і Беларусі. І даць годны адказ гэтым выклікам можа толькі адзіная нацыя, якая ўсведамляе сваю адказнасць за будучыя пакаленні. Дзеля рэальнай ацэнкі сітуацыі і далейшых крокаў па шляху ўмацавання дзяржаўнасці варта прызнаць, што таксама, як два вектары — еўрапейскі і расійскі — абавязковыя для нашага эканамічнага развіцця, так і ўзгадненне падыходаў улады і апазіцыі неабходныя для развіцця грамадства.

Беларуская апазіцыя ў цэлым канструктыўная. У яе шэрагах няма радыкальна настроеных груп, якую плануюць ужыць сілу дзеля звяржэння ўлады. Як бы ні палохалі спецслужбы ўвесь гэты час міфічнымі беларускімі тэрарыстамі, іх так і не знайшлі. Народ больш не верыць казкам пра ўзброеныя закалоты апазіцыі. Наадварот, усе бачаць, што сіла ўжываецца толькі ўладамі — супраць мірных дэманстрантаў, супраць моладзі, жанчын, сталых людзей. Такімі спосабамі можна ўтрымліваць уладу, але дамагчыся павагі да ўлады немагчыма.

Я таксама не прыхільнік радыкальных сцэнарыяў. Найбольш прымальным рашэннем для мяне была б эвалюцыя беларускай сітуацыі ў накірунку дэмакратызацыі палітычнага і грамадскага жыцця краіны. Але гэтая эвалюцыя павінна быць гарантаванай і ўстойлівай.

Цягам апошніх выбарчых кампаній я сустракаўся з тысячамі выбарцаў, свае подпісы ў падтрымку дэмакратычных кандыдатаў паставілі сотні тысяч чалавек. З упэўненасцю магу сказаць, што мільёны нашых суайчыннікаў падтрымліваюць еўрапейскі выбар, прапанаваны апазіцыяй, і чакаюць дэмакратычных зменаў у Беларусі. Без перабольшвання, за ўсімі намі глядзіць увесь свет. Старыя падыходы ўжо не спрацоўваюць.

У беларусаў ёсць традыцыйны спосаб дапамогі — талака. На мой погляд, прыйшоў час талакі ў імя Беларусі.

Апошнія падзеі вакол нашай краіны сур'ёзна занепакоілі людзей. Іх трывожыць пагроза пагаршэння матэрыяльнага стану і страты незалежнасці краіны. І адказнасць за папярэджанне гэтага ляжыць на эліце дзяржавы як ва ўладзе, так і ў апазіцыі.

Вы самі кажаце, што сёння на Беларусь накінутая эканамічная пятля і што без інвестыцый развітых дзяржаваў свету, у першую чаргу еўрапейскіх, сітуацыю не выратаваць. Падчас сустрэч з кіраўніцтвам Еўрасаюза і лідэрамі многіх еўрапейскіх краін я абмяркоўваў пытанні энергетычнай бяспекі Беларусі. Заўсёды выступаў супраць эканамічных санкцый у дачыненні да нашай краіны. Аднак зразумела, што шырокае супрацоўніцтва можа ажыццяўляцца толькі з дэмакратычнай Беларуссю, якая прытрымліваецца стандартаў еўрапейскай супольнасці. Нашая краіна губляе мільярды еўра неадплатнай дапамогі ды інвестыцый толькі з-за адной прычыны — недэмакратычнасці палітычнай сістэмы. Аўтарытарная краіна ў Еўропе сёння паспяхова развівацца не можа.

У розныя часы нацыянальныя эліты такіх краінаў як Грэцыя, Гішпанія, Партугалія, Славакія, якія знаходзіліся ў самаізаляцыі, зразумелі неабходнасць пераменаў, зрабілі выбар на карысць дэмакратызацыі і тым самым забяспечылі квітненне сваіх народаў. Я згодны выкарыстаць міжнародны аўтарытэт і кантакты, якія маюць дэмакратычныя сілы, дзеля сумеснага вырашэння праблем, што стаяць перад нашай краінай і патрабуюць неадкладнай рэакцыі.

Аднак гэта немагчыма рабіць, калі ў турмах будуць утрымлівацца мае таварышы, калі будуць працягвацца сілавыя дзеянні супраць дэмакратычнай моладзі, сведкамі якіх мы зноў сталі ў апошнія дні, калі будзе працягвацца ціск на няўрадавыя арганізацыі і партыі, калі будуць працягваць прыцясняць правы незалежных прафсаюзаў, калі не будзе адноўлена поўнамаштабная дзейнасць незалежных сродкаў масавай інфармацыі, калі будуць груба парушацца правы чалавека насуперак міжнародным абавязацельствам Беларусі.

Неабходна ў найбліжэйшы час пераадолець раскол у беларускім грамадстве. Лепшай формай для гэтага з'яўляецца дыялог. І толькі ў выніку дыялогу апазіцыі і ўлады і выпрацоўкі супольнай пазіцыі можна разлічваць на перамовы з Еўропай у мэтах развіцця эфектыўнага супрацоўніцтва.

На мой погляд, добрай магчымасцю для крокаў насустрач адно аднаму магло б стаць святкаванне дня абвяшчэння Беларускай Народнай Рэспублікі. Дата 25 сакавіка 1918 года таксама важная для беларускай незалежнасці, як і 3 ліпеня 1944 года. Грамадскасць Беларусі ўжо выказалася за сумеснае святкаванне гэтага дня, і я веру, што такое святкаванне можа стаць адпраўным пунктам для дэманстрацыі пачатку адзінства беларусаў.

У нашых з вамі сілах знайсці супольнае рашэнне для пераадолення супрацьстаяння ў грамадстве дзеля квітнення і развіцця роднай Беларусі.

Аляксандр МІЛІНКЕВІЧ,
кандыдат у прэзідэнты на выбарах-2006,
лаўрэат прэміі Еўрапейскага парламента імя А.Сахарава "За свабоду думкі".

...А цяпер заплаціце!

Калегія Мінскага абласнога суда пакінула ў сіле рашэнне Клецкага раённага суда па аднаўленні на працы маладой настаўніцы **Іны Кебікавай**.

Маладога спецыяліста звольнілі з пасады настаўніцы англійскай і беларускай моў у лістападзе мінулага года нібыта за прагул. Правіна была ў адсутнасці яе падчас школьных асенніх канікулаў на працоўным месцы, калі дзяўчына з ведама кіраўніцтва школы засталася дома, каб прывезці дровы для ацяплення хаты. Звальненне Кебікавай супала па часе з вылучэннем яе ў кандыдаты на мясцовых выбарах. Іна ўбачыла ў гэтым факце жаданне адміністрацыі пазбавіцца ад іншадумнай настаўніцы і падала ў суд. Пераканаўчым аргументам для Клецкага раённага суда стала тое, што аб звальненні маладога спецыяліста прафкаму нават не было вядома.

Сям'я Кебікавых у раёне вядомая сваімі апазіцыйнымі поглядамі. Іна разам са сваёй сястрой Таццянай былі ў палатачным гарадку на Кастрычніцкай плошчы. Пасля чаго сястру выключылі з БДУ, і цяпер яна навучаецца ў Польшчы па Праграме Каліноўскага. Незадаволенасць дырэктара школы (дарэчы, жонкі загадчыка Клецкага райана) выклікала нават тое, што маладая настаўніца носіць сувенірную сумку ад Праграмы Каліноўскага.

Паліна ВАСІЛЁВА,
www.belngo.info

У Аляксея Гарнака слоў не знайшлося...

"У момант атрымання хабару ў памеры 529 тысяч долараў затрыманы намеснік старшыні цэнтральнага праўлення "Беларускага таварыства інвалідаў", і ў адносінах да яго ўзбуджана крымінальная справа, — паведамілі карэспандэнту "Народнай волі" ў прэс-службе Пракуратуры Беларусі. — *У той жа дзень у Мінску затрыманы па гэтай жа справе намеснік старшыні Крупскага райвыканкама, які падазраецца ў вымагальніцтве хабару ў прадстаўніка маскоўскай фірмы ў памеры 212 тысяч долараў. Апошні, паўтаруся, пакуль толькі падазраецца, па законе ў следства ёсць дзесяць дзён на разбіральніцтва".*

Кажуць, што хабар намеснік старшыні "Беларускага таварыства інвалідаў" атрымаў за дапамогу ў вырашэнні пытанняў ад продажы аб'екта незавершанага будаўніцтва, што знаходзіцца ў Крупскім раёне.

У самім грамадскім аб'яднанні пакуль маўчаць як рыбы. Старшыня Крупскага райвыканкама **Аляксей Гарнак** таксама быў нешматслоўны: *"Усё гэта адбылося не ў Крупках, таму я вам нічога сказаць не магу".*

На той момант, калі Аляксей Гарнак даваў свой кароткі каментарый "Народнай волі", у яго кабінеце знаходзіліся супрацоўнікі Дзяржкантролю...

Алесь ФЁДАРАЎ.

ВІНШУЕМ!

16 лютага суседка Літва адзначае нацыянальнае свята — Дзень аднаўлення Незалежнасці Літвы.

16 лютага 1918 года была прынята Дэкларацыя аб незалежнасці Літвы.

Згодна з пактам Молатава—Рыбентропа, падпісаным 23 жніўня 1939 года, Літва адышла Германіі. 28 верасня 1939 года гэтая дамова была адкарэкціравана, і Германія перадала Літву Савецкаму Саюзу.

І толькі 11 сакавіка 1990 года Вярхоўны Савет Літвы прыняў рашэнне аб аднаўленні Літоўскай Рэспублікі.

Звычайна Дзень аднаўлення Незалежнасці Літвы шырока адзначаецца ў краіне. Да гэтай даты прымеркаваны розныя святочныя мерапрыемствы — ад афіцыйных урачыстасцяў да канцэртаў.

Мы таксама віншуем народ Літвы з дзяржаўным святам!

БЛИЦ

Недавно А.Лукашенко дал интервью агентству Рейтер.

На вопрос "Хотите ли Вы в будущем баллотироваться на пост президента?" Александр Григорьевич ответил так:

«Если бы выборы были завтра, я бы участвовал в этих выборах. Но они будут через четыре года, дай Бог мне выполнить то, что я обещал своему народу. Если я это сделаю, если я буду по-прежнему энергичным, здоровым человеком, я уходить от политической борьбы не намерен...»

Обрадовали ли слова Лукашенко жителей Беларуси?

Владимир ЦЕСЛЕР, художник:

— Я не знаю, как это комментировать и что сказать...

Николай КОВШ, заместитель председателя Брестской областной организации ОГП:

— Мы живем в центре Европы, и давайте брать пример со своих соседей. Например, хотя бы с той же России. Владимир Путин, который пользуется огромным авторитетом не только в своей стране, уже не раз заявлял о незыблемости конституционных норм, особенно, если речь идет об очередном президентском сроке.

Нельзя пользоваться результатами, на мой взгляд, сфальсифицированного референдума и быть вечным правителем. Я считаю, Лукашенко привел Беларусь в тупик, а выводить ее из тупика должны другие люди. Да и вообще пора бы уже отдохнуть Александру Григорьевичу: президентская ноша — нелегкая, он уже, как отмечают многие, устал...

Валерий ШЕВЧУК, предприниматель:

— Давайте не будет загадывать наперед. За это время может столько всего произойти! Например, как гласит восточная мудрость: или шах умрет, или шахиня замуж выйдет...

Константин МОРОЗ, заместитель председателя Белорусской социал-демократической партии (Грамада):

— Я не вижу здесь какого-то элемента новизны, того, что можно комментировать. Думаю, здесь очевидно, что, нарушив положения Конституции, Лукашенко в какой-то степени поставил себя вне закона. Это мое личное мнение.

Василий СТАРОВОЙТОВ, дважды герой Социалистического труда:

— Мне кажется, что Лукашенко пока рановато думать о следующих выборах. По-моему, перед ним сейчас другая задача стоит — помириться с Россией. А после всех его заявлений это будет сделать, на мой взгляд, не так легко... Вы же наверное недавно слышали, как назвал Лукашенко Жириновский в программе Владимира Соловьева на телеканале НТВ. Такое услышишь — несколько ночей точно спать плохо будешь...

А что касается того, что Лукашенко не намерен уходить от политической борьбы, то мне, если честно, по этому поводу даже не хочется высказываться...

Михаил РОМАНОВСКИЙ, рабочий:

— А что плохого в том, что Александр Григорьевич снова намерен бороться за пост президента?

Олег МАНАЕВ, профессор:

— Меня лично эти слова не обрадовали. Я бы не хотел, чтобы продолжалась та политика, которая продолжается последние 12 лет, чтобы мы жили такой жизнью, как живем. И нет никаких признаков того, что президент на неком четвертом сроке может все вдруг круто изменить...

Даша ПАВЛОВСКАЯ.

Амерыканцаў затрымалі ў Магілёве

У канцы мінулага тыдня ў адным з пратэстанцкіх малітоўных дамоў Магілёва мясцовая міліцыя затрымала 10 амерыканскіх місіянераў — грамадзян ЗША. Амерыканцы сцвярджалі, што праводзілі заняткі па англійскай мове. Але без дазволу беларускага Міністэрства адукацыі.

Упраўленне МУС па Магілёўскай вобласці пацвярджае факт затрымання 10 амерыканцаў. Больш за тое, стала вядома, што на замежных грамадзян складзеныя пратаколы па 185 артыкуле КаАП — "Парушэнне правілаў знаходжання замежных грамадзян у Рэспубліцы Беларусь". Пасля чаго гасцей горада над Дняпром адпусцілі.

Да затрымання амерыканцы ўжо з месяц працавалі па запрашэнні магілёўскага дабрачыннага аб'яднання "Стэфан", якое і зладзіла шэраг бясплатных семінараў-практыкумаў па вывучэнні англійскай мовы. Заняткі праходзілі ў адным з малітоўных дамоў у Магілёве.

Амерыканскія грамадзяне звярталіся ў абласное ўпраўленне адукацыі, аднак адтуль іх "пераадрасавалі" ў Міністэрства адукацыі: падобныя праблемы вырашае менавіта гэтае ведамства. Старшыня аб'яднання "Стэфан" Дзмітрый Канцавенка лічыць, што такія адносіны да замежных грамадзян выклікала нібыта іхняя рэлігійная дзейнасць у горадзе.

Амерыканскім місіянерам пагражае папярэджанне або штраф да дваццаці мінімальных велічынь. Гэта трэцяе па ліку затрыманне замежных грамадзян за апошнія тры месяцы ў Магілёве: затрымліваліся грамадзяне Польшчы, Літвы, Украіны, Чэхіі. Праўда, ранейшыя затрыманні праводзіліся з-за кантактаў замежнікаў з прадстаўнікамі недзяржаўных арганізацый.

Прадстаўнік амбасады ЗША адмовіўся ад якіх бы то ні было каментарыяў.

Георгій ГЛЕБУСЬ.

Што ні дзень — то даражэюць кватэры

Паводле інфармацыі газеты "Недвижимость Беларуси", кошт аднаго квадратнага метра мінскай аднапакаёўкі складае на сёння 1520 долараў.

Дарэчы, найтаннейшы квадратны метр — у чатырохпакаёвых кватэрах: 1151 долар (+25 долараў супраць мінулага тыдня).

БРЮССЕЛЬ—МИНСК

«Осторожность и скептичность, — вот что мы должны демонстрировать по поводу всех заявлений Лукашенко...»

В Европейском парламенте прошел день Беларуси

Непривычно долго звучало название нашей страны в стенах главного законодательного органа Европейского Союза в минувший четверг в Брюсселе. Целый день, с 9 утра и до позднего вечера проблемы современной Беларуси обсуждались депутатами Европейского парламента, чиновниками Еврокомиссии, Совета Европейского Союза, представителями Госдепартамента США. Из Минска приехали и выступили с высокой трибуны кандидат объединенных демократических сил **Александр Милинкевич,** председатель ОО "БНФ "Адраджэньне" **Винцук Вечерко**, председатель Белорусской ассоциации журналистов **Жанна Литвина**, социолог **Андрей Вардомацкий**, кинорежиссер **Юрий Хащевацкий**, супруга экс-кандидата в президенты Александра Козулина — **Ирина Козулина**.

Любопытно, что первоначально имя **Ирины Козулиной** в списках участников конференции не значилось. Только благодаря инициативе и усилиям литовских дипломатов жена осужденного экс-кандидата в президенты все-таки приняла участие в высоком форуме. И выступила. Причем ее выступление, по мнению присутствовавших на форуме белорусов, проживающих сейчас в Бельгии, оказалось самым ярким. Хоть и было весьма коротким. *"Я едва сдерживала слезы"*, — призналась мне в кулуарах президент русскоязычной платформы "Солидарность" в Бельгии Галина Матюшина.

Задал тон всем участникам конференции, выступив первым, президент Европарламента **Ханс-Герт Поттеринг**. Президент говорил о том, что *"гражданское общество в Беларуси находится под угрозой"*, и что ЕС "нужно демонстрировать чрезвычайную осторожность и скептичность по поводу всех заявлений Лукашенко", имея в виду недавние реверансы белорусского лидера в сторону Европейского Союза, высказанные в интервью агентству "Рейтер". *"Откройте двери тюремных камер, в которых находятся политзаключенные! Вы за них несете персональную ответственность!* — эмоционально выразился г-н Поттеринг, обращаясь к Лукашенко. — *Диктатуры в Европе, как показывает новейшая история, не задерживаются, демократия и свобода в Беларуси все равно победят!"*

Богдан Клих, председатель специальной комиссии Европарламента по отношениям с Беларусью, подчеркнул, что *"последние местные выборы у нас в стране, как и президентские, снова не были ни свободными, ни справедливыми"*. Недавние признания Александра Григорьевича в любви к Западу Клих назвал *"попытками найти друзей за пределами России"*, а также "скорее игрой, чем реальным желанием белорусского диктатора вести свою страну к интеграции с Европейским Союзом".

Александр Милинкевич начал свое выступление как истинный джентльмен, призвав всех присутствующих поприветствовать Ирину Козулину, жену своего, по сути, конкурента на президентских выборах-2006. Милинкевич долго рассуждал о корнях и последствиях недавнего российско-белорусского газово-нефтяного конфликта, а также в очередной раз напомнил еврочиновникам об отсутствии в Беларуси свободы прессы, о командно-административной экономике, о политзаключенных, которых, как заявил Милинкевич, в Беларуси на сегодняшний день уже десять. В том, что касается возможной экономической помощи Евросоюза Беларуси, демкандидат сказал так: *"Я за эволюцию, я против голодных бунтов. Но экономически Беларусь можно поддерживать только в одном случае, — если власть меняется: освобождает политзаключенных, дает возможность свободно распространяться независимой прессе"*.

Попытки же решать белорусские проблемы, обсуждая их в первую очередь с Москвой, Александр Милинкевич назвал ошибкой: *"Некоторые на Западе думают, что Лукашенко — диктатор, а значит, не партнер, а оппозиция в Беларуси слаба, и поэтому предпочитают обсуждать наши проблемы с Кремлем. Нельзя работать над головами тех, кто борется сейчас в Беларуси за свободу!"*

"Все евроструктуры должны соблюдать единый план действий, продолжать политику честную, моральную и принципиальную, — подчеркнул лауреат премии Андрея Сахарова, делая, видимо, предисловие к речи следующего выступающего, председателя ПАСЕ **Рене ван дер Линдена**. Его недавний визит в Беларусь весьма неоднозначно оценили в западной прессе.

"Мой визит в Минск, — то ли убеждал присутствующих, то ли оправдывался г-н ван дер Линден из президиума форума, — *обсуждался в ПАСЕ более года и служил началом возможного диалога с белорусскими властями, — особенно в том, что касается расследования дел исчезнувших, обсуждения проблемы несвободных выборов"*. На реплику Богдана Клиха о том, что *"должна быть четкая разделительная линия между диалогом и легитимизацией существующего в Беларуси диктаторского режима"*, председатель ПАСЕ отреагировал довольно нервно. И продолжил завязавшийся диалог репликой: *"Политика, так же, как и игра в футбол, предполагает наличие двух сильных команд — команды власти и команды оппозиции. Если команда власти сильна, а команда оппозиции представляет третью лигу, то такая игра неинтересна зрителю, он не получает от такого футбола удовольствия"*.

(Окончание на 2-й стр.)

Народная Воля http://www.nv-online.info
16 ЛЮТАГА 2007 г.

БРЮССЕЛЬ—МИНСК

«Осторожность и скептичность, — вот что мы должны демонстрировать по поводу всех заявлений Лукашенко...»

(Окончание. Начало на 1-й стр.)

Рене ван дер Линден также высказал свое возмущение тем, что недавно почти в два раза выросла стоимость Шенгенской визы для белорусов. "На словах мы постоянно подчеркиваем свою открытость, но на деле мешаем белорусам посещать Европу, чтобы они своими глазами могли видеть преимущества демократии и рыночной экономики", — сказал Рене ван дер Линден. Это замечание председателя ПАСЕ поддерживали и другие участники форума. По мнению **Стивена Никса**, директора региональных программ фонда "Евразия", Шенгенская виза должна стоить в Беларуси не более пяти евро.

Интересную цифру в этой связи привел директор Варшавского центра восточных исследований **Яцек Сикоцки**. Согласно исследованию этого центра, Европу в 2005 году посетил миллион белорусов, тогда как Россию — 850 тысяч человек.

Председатель БАЖ Жанна Литвина согласилась с главой ПАСЕ в том, что необходим диалог, в том числе и с властями. *"Но такой диалог возможен только в том случае*, — считает Ж. Литвина, — *когда в государственных СМИ Беларуси прекратится кампания шельмования тех, чье мнение расходится с официальным. Власть для начала диалога должна открыть информационное пространство, разрешить свободно распространяться независимым СМИ".*

Оригинальное предложение Александру Лукашенко на брюссельском форуме сделал представитель Еврокомиссии **Енеко Ландабуру**. Он предложил официальному Минску консалтинговые услуги специалистов-экономистов Европейской комиссии, чтобы "как можно быстрее переустроить командно-административную экономику Беларуси на рыночные рельсы". Вспоминается, что подобные предложения уже неоднократно отправляла на почтовый ящик на К.Маркса, 38 Объединенная гражданская партия, где есть достаточно своих специалистов.

Дэвид Крамер, представитель Госдепартамента США, высказал старые мысли о том, что *"Беларусь сама себя изолирует в мире"*, что *"Западу следует поддерживать гражданское общество в Беларуси, неправительственные организации, независимые СМИ". "США не верят в искренность Лукашенко, когда он говорит, что ищет партнеров на Западе. Последнее сближение Беларуси с Ираном наглядно демонстрирует, что никаких серьезных и реальных изменений в политике официального Минска не наблюдается"*, — такое мнение высказал г-н Крамер.

Делясь украинским опытом "оранжевой революции", бывший министр иностранных дел Украины **Борис Тарасюк** пошутил насчет того, что "приехал в Брюссель, чтобы рассказать, как завоевывать власть, а не как ее терять", имея, видимо, в виду свое недавнее отстранение от министерской должности. По мнению Тарасюка, "ситуация в Беларуси гораздо сложнее, чем в Украине". "В Украине у оппозиции был как минимум один национальный телеканал, масса независимых газет, поддержка бизнеса, — рассказывает Тарасюк. — В Беларуси всего этого нет, но зато есть объединенная оппозиция и единый лидер. Это уже хорошо! Но вы должны понять: поддержка международных структур не должна заменять активность оппозиции внутри страны, а может лишь дополнять ее..."

Слегка разочарованными в конце конференции оказались брюссельские журналисты. Большинство из них пришло в овальный зал Европарламента с целью услышать в первую очередь представителей демократической общественности Беларуси, — чтобы из первых уст, так сказать, получить информацию о том, что происходит в нашей стране. Но увидели журналисты преимущественно брюссельских политиков и чиновников, с которыми они и так достаточно часто сталкиваются и которые говорят одно и то же. Суть их речей неизменна: пока из Минска не будет виден сигнал об изменении ситуации к лучшему, ни о какой перемене отношения Европы к режиму Лукашенко говорить не приходится. Пока такого сигнала, как подчеркивали все выступающие, не слышно.

Символично закончил День Беларуси в Европарламенте депутат **Чарльз Таннок**. Он иронично подытожил: *"За последние пять лет в Беларуси — европейской Кубе, ничего не изменилось, а значит, нам, думаю, еще придется собираться на подобные конференции"*.

Александр СИЛИЧ, специально для "Народной воли".

Брюссель, Бельгия.

СЛЫШАЛИ?

ГТК Беларуси объявил войну «соляровозам»

С 1 марта в Беларуси вводится таможенное оформление автомобильного топлива (бензин, дизельное топливо), вывозимого физическими лицами. Такое решение принял ГТК Беларуси в целях упорядочения вывоза топлива за пределы страны, а также предотвращения фактов незаконной предпринимательской деятельности.

Как сообщила пресс-служба ГТК, в первую очередь эта мера будет касаться случаев вывоза топлива под видом личного имущества в баках транспортных средств. Гражданам Беларуси, выезжающим за пределы страны на автомобиле чаще, чем один раз в течение трех суток, будет предложено задекларировать вывозимое топливо, после чего они будут информированы под роспись о том, что в дальнейшем данный товар подлежит таможенному оформлению в общем порядке с применением мер тарифного и нетарифного регулирования.

В случае отказа таких лиц провести таможенное оформление топливо подлежит задержанию в соответствии с действующим законодательством.

Вместе с тем, пояснили в ГТК, данное требование — декларирование и таможенное оформление — при предъявлении соответствующих документов не будет распространяться на членов официальных иностранных делегаций, прибывших в Беларусь с визитом, сотрудников дипмиссий и международных организаций, служащих госорганов, направляемых в служебные загранкомандировки, водителей автотранспортных средств, осуществляющих международные перевозки, а также физических лиц, выезжающих на оздоровление или пересекающих границу на основании трудовых виз.

Соб.инф.

ПАЗІЦЫЯ

Дык хто ж хворы на «курыную слепату»?

Паважаная "Народная воля", дазвольце выказаць думкі, якія падзяляюць многія мае землякі-пружанцы, людзі, што душой трывожацца за лёс Беларусі, прагнуць бачыць яе вольнай, незалежнай, багатай, паважанай ва ўсім свеце.

Дык вось, нам добра памятаецца ўжо даўні, але незабыўны артыкул Зянона Пазьняка "О русском империализме и его опасности", апублікаваны больш за дзесятак гадоў у тагачаснай "Народной газете", галоўным рэдактарам якой быў вельмі паважаны спадар Іосіф Сярэдзіч. Тая публікацыя літаральна ўскалыхнула грамадства, бы землятрус, атрымала шырокі розгалас. Праўда, гучна чуліся і абуральныя крыкі пракамуністычных рупараў, апалагетаў учарашняга дня, зацятых праціўнікаў дэмакратызацыі ў краіне. Яны, ледзь не трацячы прытомнасць, усчалі сапраўдны вэрхал, віск, лямант: Пазьняк, ці бачыце, "абражае вялікі рускі народ", "хоча пасварыць нас са старэйшым братам", без прывязкі да якога мы, беларусы, ну нічагусенькі не вартыя.

Было дзіўна, што ў той раз'юшаны хор упляталіся і галасы некаторых нядаўніх паплечнікаў Зянона Станіслававіча. Ніякіх слушных контраргументаў ні ў кога не было — яны проста не разумелі яго прадбачлівасці. А мо нават і разумелі, але спалохаліся тады яшчэ нязвыклай мужнасці і адвагі называць рэчы сваімі імёнамі і, глыбока аналізуючы з'явы і факты, перакульваючы застарэлыя стэрэатыпы, выказвацца па самай сутнасці, пераканаўча і доказна. І гранічна чэсна, рэзка і прама.

Прайшоў значны прамежак часу, прынёс новыя рэаліі. Але што мы назіраем сёння ў той Расіі? На жаль, якраз тое, што прадбачыў, за папярэджанне аб чым падвяргаўся шалёным нападкам лідэр Беларускага Народнага фронту. Нават "вяршкі" таго, што нам паказваюць па расійскіх тэлеканалах, сведчаць: Расія і сёння невыводна імперская дзяржава з памкненнем любой цаной уладарыць на постсавецкай прасторы. А што тычыцца Беларусі, то — далучыць яе да сябе хоць асобнымі абласцямі. І гэтага многія палітыкі суседняй краіны не хаваюць.

Нічога не змянілася па сутнасці і пасля аглушальнага нафтагазавага канфлікту, які напалохаў нават Еўропу бессаромным выкарыстаннем Расіяй сваіх энерганосьбітаў у якасці зброі палітычнага ўціску суседзяў. І хоць на нядаўняй (1 лютага) вялікай прэс-канферэнцыі У.Пуцін пра беларускія *"вобласці"* ўжо разлікова-тактычна змаўчаў, але па-ранейшаму разважаў, бы нічога і не здарылася, пра *"Союзную державу", "единую валюту"* і ўсё ў тым жа духу. А непераўзыдзены ў дэмагогіі і нахабстве *"шчыры"* сябра і ранейшы госць Аляксандра Рыгоравіча У.Жырыноўскі ад *"вхождения Белоруссии в Россию шестью областями"* перайшоў на новы фармат *"братской союзной державы"*: **"Пусть входят единым Минским округом и делают то, что мы скажем!"** — істэрычна беснаваўся ён у тэлестудыі падчас НТБэшнай праграмы "К барьеру!". І пры гэтым сыпаў у бок кіраўніка Беларусі такімі абразлівымі мянушкамі, якія я не бяруся паўтарыць.

Не раз і не два ў розныя часы папярэджваў З.Пазьняк наша грамадства аб небяспецы сляпога следавання ў фарватэры ўсходняй суседкі, арыентацыі выключна на яе рэсурсы, безагляднага зліцця ў абдымках з імперыяй, якая стагоддзямі грунтавалася на прынцыпах усходняй дэспатыі. Але яго слушныя, пераканаўчыя артыкулы і публічныя выступы, у тым ліку і ў Вярхоўным Савеце, аб неабходнасці абачлівай многавектарнай палітыкі, аб тым, каб, ладзячы з Расіяй узаемавыгадныя добрасуседскія стасункі, не завязвацца толькі на яе адну. І разгледзець магчымасць будаўніцтва Чарнаморска-Балтыйскага калектара, пазбегнуць поўнай залежнасці ад усходняй суседкі ў энергетычным (а значыць, і ў палітычным) плане.

Ды толькі ўсё гэта прымалася ў штыкі, адмяталася з парогу, падымаліся на смех як *"далёкае ад рэальнасці"*. Маўляў, у нас саміх жа нічога няма, а Расія нам ледзь не задарма *"ўсё дасць"*. Цяпер многім з тых *"вясёлых"* крытыкаў, а галоўнае, усім беларусам не да смеху. Гэта над імі, над здаровым сэнсам смяяліся. Упартае ж глупства да дабра не даводзіць. Даводзіць да народнай бяды. І давяло...

11 студзеня гэтага года "Народная воля" змясціла новы артыкул старшыні Кансерватыўна-Хрысціянскай партыі Зянона Пазьняка на актуальнейшую тэму "Небяспека расійскага фашызму". Чытачы газеты атрымалі магчымасць зноў пачуць голас выдатнага палітыка сучаснасці, прагнозы якога, хоць ён не выдае сябе за аракула і не гадае на кафейнай гушчы, *"чамусьці"* заўжды збываюцца. Упэўнены, ён сам быў бы вельмі рады памыліцца, але... Зноў, у каторы раз, на неабвержных фактах мусіць даводзіць пагрозу *"зліцця"* з дзяржавай, дзе на вачах, з ростам манаполій мацнеюць парасткі нацызму: *"разгортванне ксенафобіі, этнічныя чысткі, тэрарызм і сістэма заказных забойстваў, стварэнне штучных прафашысцкіх арганізацый ("казакі", розныя партыйкі, "саюзы" і т.д.)"*. Што, гэта не так?

Улада ў гэтай краіне належыць стаўленікам драпежнага буйнога капіталу, які прысабечыў незлічоныя багацці краіны (узгадайце хаця б трансліраванае па тэлебачанні патрабаванне Пуціна да свайго ўраду: *"Вы обязаны непременно обеспечить защиту интересов российских компаний"*. Заўважце, ні *"народ"*, ні *"дзяржава"* тут нават у рытарычным плане, для прыліку не згадваюцца. Усё ясна і празрыста — што, для каго і дзеля чаго... Магутныя алігархічныя карпарацыі хай тлусцеюць, народ гібее, седзячы на *"прыхватызаваных"* нафце, золаце і ўсім астатнім, а дэмакратыя ўсё больш уціскаецца... *Беларусь жа патрэбна, па прызнанні расійскіх палітыкаў, "для обеспечения стратегической безопасности России"*.

Дык што — нам пазарэз трэба яднацца з такой дзяржавай? Хай кожны сам сабе дасць на гэта адказ. Я ж зноў спашлюся на аргументацыю Зянона Станіслававіча і прапаную тым, хто зможа і пажадае, прывесці свае рэзоны.

"Небяспека найперш у тым, — піша ён, — *што гэтая старая-новая расійская палітыка непасрэдным чынам закранае і насоўваецца на Беларусь. Сутнасць яе стратэгіі — знішчэнне беларускай нацыі. Пачалі з сімвалаў. Цяпер дабіваюць ужо нацыянальную школу і паслядоўна вынішчаюць мову, ідзе нечуваная алкагалізацыя беларускага насельніцтва.*

...У існуючым становішчы грамадства без спелай нацыянальнай свядомасці практычна цалкам безабароннае перад фашыстоўскай чужынскай палітыкай... Павінна быць ідэйная і духоўная база, стоячы на якой людзі могуць супрацьстаяць расійскаму фашызму і не дадуць яму захапіць Беларусь".

Цалкам згодны. Галоўнае апірышча ўсіх, хто стаіць за вольную, незалежную, шчаслівую Беларусь — Нацыянальная ідэя. Для мяне, маіх сяброў і, спадзяюся, многіх сумленных грамадзян у тым няма ніякага сумневу. Але, відавочна, знаходзяцца і такія, хто, сам хворы на *"курыную слепату"*, вінаваціць лідэра КХП—БНФ у нібыта *"адарванасці ад рэальнасці"*, у *"няведанні"* таго, што адбываецца ў Беларусі. Некаторыя з іх далі, як ім здаецца, рашучы *"адлуп"* аўтару артыкула "Небяспека расійскага фашызму" ў тым жа нумары "Народнай волі". Прычым у кампаніі каментатараў-дэмакратаў — палітычных і грамадскіх дзеячаў **Тацяны Ванінай, Уладзіміра Лабковіча, Валянціна Голубева, Валерыя Ухналёва** апынуўся і небезвядомы "звышдэмакрат", дэпутат Палаты прадстаўнікоў **Сяргей Касцян.**

Лічу, рэдакцыя правільна зрабіла, прадаставіўшы магчымасць дзеля шматколернасці палітры выказацца розным палітыкам, данесці да чытачоў іх погляды, довады. Але... На жаль, ніякай *"шматколернасці"* не атрымалася. Што "лібералы-дэмакраты", што *"палатнік"* дружненька накінуліся на З.Пазьняка, навешваючы на яго даўно знаёмыя, але беспадстаўныя шыльды *непалітыка,* якога, маўляў, і не варта каментаваць. Але ж каментуюць: "Не ўяўляе", "Не разумее", "Не ведае"... Больш за тое, некаторыя "каментатары" (Т.Ваніна, напрыклад) не пасаромеліся замест аргументаў кідаць у бок апанента каменні абразлівага, "уласнаручнага" медыцынскага дыягназу — за што, між іншым, у нармальнай краіне любы грамадзянін, не толькі кіраўнік дзяржавы, можа патрабаваць і дабіцца судовай сатысфакцыі. Але З.Пазьняк зараз сапраўды далёка (у фізічным сэнсе) ад Беларусі, і абражаць яго можна колькі заўгодна, у юрыдычным плане нічым пры гэтым не рызыкуючы. Пра маральнасць жа такіх абвінавачанняў гаварыць не варта — яна выстаўлена напаказ самімі аўтарамі.

Калі верыць ім, дык З.Пазьняк нібыта пераказвае тое, што зараз гавораць на Захадзе. А, маўляў, палітыка Расіі ў дачыненні да Беларусі — ну ледзь не белая і пушыстая. На Беларусь яна і не думае квапіцца, гэта ўсё прыдумка Пазьняка...

Але дзе ж аргументы і факты? Ну хоць адзін-аднусенькі! Няма. Замест іх — пустое перамолванне узятых са столі слоў. Якая, скажыце, патрэба Зянону Станіслававічу паўтараць тое, што кажуць сёння на Захадзе", калі з самага пачатку ён паслядоўна і доказна пераконвае ў тым, ад чаго многія палітыкі і ў Беларусі, і на Захадзе раней папросту адмахваліся? Калі вы, паважаныя апаненты, самі *"не ў курсе"* і *"не ў тэме"* ці разлічваеце на спрэс недасведчаную, цёмную публіку, то поза унтэр-афіцэрскай ўдавы, прабачце, якраз для вас.

Сёння ўжо (праўда, цягам ажно дванаццаці незваротна страчаных для Беларусі гадоў) кіраўнік дзяржавы, якога цяжка западозрыць у большай, чым ваша, прыхільнасці да стваральніка Беларускага Народнага фронту, нарэшце ўсвядоміў і хоцькі-няхоцькі мусіў прылюдна прызнаць: **так, мы зрабілі ў сваёй палітыцы вялікую памылку, абапіраючыся толькі на адно, расійскае крыло.** Трэба шукаць альтэрнатыўныя крыніцы энергетычных рэсурсаў, адкрываць для сябе больш шырокі свет, развіваць з ім эканамічныя кантакты.

Можна толькі ўявіць, як нялёгка было Аляксандру Рыгоравічу вымаўляць словы аб краху ранейшай знешнепалітычнай арыентацыі: *"Мы молились на Россию, а она набросила нам петлю на шею"*, — так бы мовіць, адплаціла за сляпую вернападданасць.

Ды хіба можна было чакаць іншага ад імперскай палітыкі суседняй дзяржавы? Ці не ад такога выходу, пры недальнабачным курсе нашага кіраўніцтва, засцерагаў на працягу многіх год Зянон Станіслававіч? Пачуць бы яго, *"непалітыка"*, — і краіна была б ужо далёка наперадзе ва ўсіх сэнсах! Не пачулі, зрабіўшы тым адчувальны ўрон краіне. Некаторыя ж нашы *"дэмакратычныя"* дзеячы, па ўсім відаць, заклапочаны больш уласнымі амбіцыямі, чым лёсам Бацькаўшчыны, не чуюць і зараз. І, папракаючы З.Пазьняка нібыта за адарванасць ад Беларусі, самі не бачаць і не разумеюць, што дзеецца ў іх пад носам і вакол, усё пазіраюць у бок Масквы. Едуць туды то на *"агледзіны"*, то за маральнай (а можа, не толькі маральнай?) падтрымкай. А дзеля чаго? Як быццам можна прывезці мяхі з дэмакратыяй аднекуль нават з таго месца, дзе яна ёсць. На што ваша спадзева, шаноўныя? Ці ёсць рэальны шанц разлічваць на эліту імперскай Расіі ў дэмакратызацыі Беларусі? Нядаўна Пуцін выказаўся ясней яснага наконт таго, што даўно ўжо было сакрэтам палішынеля (а для нашай "дэмакратычнай" апазіцыі, пэўна, сакрэтам застаецца і зараз): маўляў, мы (расійскае кіраўніцтва) не хаваем, што многамільярднымі доларавымі ўліваннямі падтрымлівалі А.Лукашэнку, у тым ліку і падчас апошніх прэзідэнцкіх выбараў.

Вось цана вашым ружовым мроям наконт таго, што беларускім дэмакратам *"Россия поможет"*.

Упэўнены: як бы вонкава ні мянялася тактыка і рыторыка *"старэйшага брата"* ў дачыненнях да *"сінявокай сястры"*, стратэгія застаецца ранейшай: не дапусціць сапраўднай незалежнасці Беларусі. Вось ужо і галоўны камуніст Расіі Г.Зюганаў — пасланцом Расійскай думы — прымчаўся ў Мінск, за ім — апантаныя аб'яднальшчыкі А.Праханаў і Д.Рагозін, каб неяк улагодзіць Аляксандра Рыгоравіча, падмацаваць яго імпэт на ранейшы *"саюзны"* курс. І, здаецца, намазоліўшыя вушы спевы пра *"один народ", "многовековую историческую общность", "союзную державу"*, якая (вось толькі б яшчэ Украіну ў гэты хаўрус зацягнуць!) можа ўзвысіцца над усім светам, не выклікалі пярэчання ў высокага беларускага суразмоўцы. *"Если мы не бежим теперь оголтело в Россию,* — патлумачыў ён сваю сённяшнюю пазіцыю, — *то только потому, что Россия этого не хочет"*. Ну, а калі захоча — скажам, паманіць прывідам троннай ці калятроннай "саюзнай" пасады? Тады што, мы зноў можам вярнуцца да *"оголтелости"* ў неразважных інтэграцыйных гульнях?

Не, над незалежнасцю краіны, за якую ахвярна змагаліся многія пакаленні беларусаў, небяспека яшчэ не мінула. За яе і нам трэба змагацца. Гэта галоўная каштоўнасць, без якой немагчымы свабода, дэмакратыя, росквіт Бацькаўшчыны. Так, гэта няпросты шлях, шлях доўгай, карпатлівай і ўсвядомленай працы па абуджэнні ў нашых людзях сапраўднага патрыятызму — праз Беларускую нацыянальную ідэю, прыхільнасць і любоў да роднай мовы, гісторыі, культуры, імкненне зрабіць усё, каб мы маглі ганарыцца сваёй Айчынай. Перамогу дабра нельга ні прывезці ў мяхах, ні прынесці на штыках — яна павінна выспець, адбыцца спачатку ў чалавечых душах.

Так думаю я, звычайны абывацель з далёкай ад сталіцы глыбінкі, але абывацель (у сэнсе не палітык, не нейкі дзеяч), неабыякавы да лёсу сваіх дзяцей і ўнукаў, маёй зямлі. Так лічаць і мае аднадумцы, а іх не так ужо і мала, хоць, прызнаю, пакуль не абсалютная большасць. Нам усім востра нестае арганізаванасці, інфармаванасці, беларускага асветніцтва. Вось тут — годнае і шырокае поле дзейнасці для нашай апазіцыі — гуртаваць прыхільнікаў дэмакратычных перамен дзеля адраджэння незалежнасці Беларусі на грунце духоўных каштоўнасцяў, перададзеных нам продкамі.

А чым насамрэч займаецца наша апазіцыя? Не буду ацэньваць яе дзейнасць у цэлым, хоць маю на гэта права як грамадзянін (магчыма, самае галоўнае, істотнае схавана за кадрам, засакрэчана ад народа і *"ворагаў"*?). Але па тым, што кажуць некаторыя апазіцыйныя дзеячы на старонках шаноўнай "Народнай волі", можна зрабіць выснову: больш за ўсё імпэту яны аддаюць ўнутрыпартыйным разборкам, валтузні вакол *"майкі лідэра"*, міжсабойным *"шлюбам і разводам"*, цьмяным абяцанням *"распрацаваць новы план аб распрацоўцы новага плана..."* і г.д. Адзін з іх публічна хваліцца, што пад сцягам яго сталічнай партыйнай суполкі ўжо "ажно" 60—70 актыўных сяброў (і гэта амаль у двухмільённым горадзе!), і што гэтая *"сіла"* ўжо заявіла пра сябе ў мясцовых выбарах. Нічога, праўда, што з абсалютна нулявым вынікам... Другі, не нацешыўшыся бясконцымі паразамі ў папярэдніх выбарчых кампаніях па драконаўскіх правілах улады, будуе манілаўскія пражэкты на выбары будучыя. Трэцяя, парыруючы папрок у несфармаванасці нацыянальнай свядомасці многіх дэмакратычных лідэраў, адказвае па схеме вядомага дыялога старой вяскоўкі з глухой суседкай: "Здарова, кума!" — "На рынке была!.." Чацвёрты завярае, што паколькі *"збольшага ўсе сур'ёзныя суб'екты ў беларускай палітыцы выступаюць у падтрымку незалежнасці Беларусі"*, то... *"гэтае пытанне ўжо нават нікім не абмяркоўваецца"*. Згодзен — не абмяркоўваецца. А трэба, каб гучала штодня,і не толькі ў партыйных кулуарах, а было звернута да ўсіх грамадзян краіны. Бо гэта пытанне жыцця і смерці без усялякага перабольшання.

Калі, скажыце, гэтай гарачай, найактуальнейшай тэме была прысвечана масавая грамадская акцыя? Так, ідуць размовы аб святкаванні недалёкага ўжо Дня Волі (незалежнасці) 25 сакавіка. А чаму на працягу цэлага года ўпушчаны, не падтрыманы і не развіты ўздымны духоўны патэнцыял Плошчы ў сакавіку-2006? Чаму не ладзяцца шматлюдныя мірныя пратэсты супраць расправы з вашым жа паплечнікам А.Казуліным, які пакутуе ў турме? Як і ў падтрымку беларускай мовы і культуры, загнаных уладамі ў цёмны кут, а таксама незалежніцкай прэсы — той жа "Народнай волі", якую, у парушэнне закона, душаць усімі сродкамі і сіламі?

Шмат яшчэ "чаму?" можна сказаць, яны — на языку ў многіх грамадзян краіны. Але таму-сяму з вас, дэмпалітыкі, проста няма калі займацца патрэбнай справай: трэба ж падкідваць дровы ў касцёр нязводных міжусобіц з-за таго, хто сярод вас *"самы галоўны"*. Ды яшчэ паліваць брудам — ці не з рэўнасці? — мужнага, непахіснага палітыка-патрыёта, мысляра і празорцы, сэрца якога баліць за Беларусь і б'ецца дзеля Беларусі. Толькі заплямціць яго аўтарытэт, намагаючыся гэтым падвысіць свой, ні ў кога не атрымліваецца. Смешная, прабачце, дурнота, шаноўныя, кажу вам гэта ў вочы.

Разумею, вам не пад густ горкая праўда, якую гаворыць Зянон Пазьняк, трапна заўважаючы: *"...людзі, якія ідуць у беларускую палітыку, не бачачы, не разумеючы, і не хочучы разумець, хто і чаму знішчае беларускі народ, гэтыя людзі, як правіла, прыносяць шкоду Беларусі і асабіста сабе. Слепата ёсць слепата"*. Як у ваду глядзіць. Пэўна, і сапраўды "большое видится на расстоянии".

Кожны, хто, як Зянон Станіслававіч, зычыць шчасця Радзіме, той сэрцам адгукаецца на яго голас. Ён даносіцца здалёк, але мы яго добра чуем. Ён дае нам магутную духоўную падтрымку, веру ў будучыню Бацькаўшчыны, якую ніхто не абароніць, акрамя нас саміх.

Мікола КАНАХОВІЧ, афіцэр у адстаўцы.

г.Пружаны.

СТОП-КАДР



Хвіліна шчасця...

Фота Юрыя ДЗЯДЗІНКІНА.

ХАПУН

В доход государства...

За занятие незарегистрированной предпринимательской деятельностью по оказанию услуг такси обращено в доход государства 110 автотранспортных средств (за 2005 год — 49 автомобилей). Такие данные сообщило Министерство по налогам и сборам.

Наибольшее количество нарушений выявлено в Минске, где конфисковано 56 единиц автотранспорта и в Гродненской области, где конфисковано 20 машин.

По планам МВД Беларуси, уже в ближайшие месяцы те, кто занимается частным извозом, поменяют номерные знаки. Новые знаки будут желтого цвета с буквами ТАХ. Вместе с лицензией таксисты будут получать такие специальные номерные знаки, что позволит отличить их машины от нелегальных извозчиков не только сотрудникам милиции, но и простым гражданам.

Олег СНОВ.

ВІДАВОЧНАЕ—НЕВЕРАГОДНАЕ

Выцягнулі з таго свету

У Буда-Кашалёўскім раёне аб'явіўся чалавек, які абверг разумных медыкаў. Яны лічаць, што доза ў чатыры праміле алкаголю ў крыві чалавека з'яўляецца смяротнай.

У крыві хлопца, якога ў беспрытомным стане даставілі ў тэрытарыяльнае медыцынскае аб'яднанне ў Буда-Кашалёве, утрымлівалася 11,7 праміле. Як паведамляюць мясцовыя СМІ, ён знаходзіўся ў коме, не было чутно ні дыханне, ні сэрцабіццё. Але праз тры дні рэанімацыйныя мерапрыемствы далі плён. П'янтос выжыў-такі. Зараз урачы ўжо не непакояцца за яго жыццё. Але ці кіне піць гэты шчасліўчык, ніхто не ведае.

Ул.інф.

РЭВІЗІЯ

Кантралёры прайшліся па школах...

Камітэт дзяржаўнага кантролю праверыў, як ідзе рамонт школ краіны і як выкарыстоўваюцца выдзеленыя на гэтыя мэты сродкі. Высветлілася, што нават пасля трагедыі ў Краснаполлі некаторыя рызыкуюць жыццём і здароўем дзяцей.

Так, капітальны рамонт школы №19 Гомеля, які патрабавалася ў экстранным парадку пачаць тры гады таму, яшчэ толькі плануецца. І то грошы былі выдзелены на гэты год толькі пасля ўмяшальніцтва КДК.

"Многія будынкі ўстаноў адукацыі састарэлі і маральна, і фізічна, не адпавядаюць сучасным патрабаванням. Асабліва часта гэта сустракаецца ў сельскай мясцовасці, дзе частка дзяцей вымушана вучыцца ў школах з пячным ацяпленнем, якія не маюць нават халоднага водазабеспячэння і каналізацыі", — паведамляе прэс-служба КДК. Канстатуецца таксама, што ў шэрагу выпадкаў рамонт школ праводзіўся без афармлення дакументацыі ў органах Дзяржбуднагляду, і нават аб'екты прымаліся пасля рамонту без адпаведных актаў.

Усяго Дзяржкантролем было праверана 117 устаноў адукацыі, дзе ў апошнія гады вяліся рамонтныя работы. На ўсіх (!) зафіксавана завышэнне кошту гэтых работ.

Лілія ВОРАНАВА.

Народная Воля http://www.nv-online.info
16 ЛЮТАГА 2007 г.

ФАКТ

Мінус трынаццаць

За 2006 год колькасць фермерскіх гаспадарак у Гомельскай вобласці скарацілася на 13 і складае зараз 245 адзінак. Аб гэтым паведаміў у Гомелі на справаздачна-выбарчым сходзе старшыня абласной асацыяцыі фермераў Міхаіл БАЙДА.

Па яго даных, маючы ў сваім распараджэнні 1,2% зямлі, фермеры атрымалі 8 працэнтаў усёй сельскагаспадарчай прадукцыі, якая вырашчана ў рэгіёне.

Некаторыя фермеры лічаць, што энергетычны канфлікт з Расіяй істотна адаб'ецца на беларускіх фермерскіх гаспадарках і гэты год стане яшчэ больш цяжкім. *"Канешне, канфлікт адаб'ецца,* — сказаў БелаПАН фермер Міхаіл Кананенка з Хойніцкага раёна. — *Паліва — асноўнае для фермера. Раней купляў яго па 800 рублёў за літр, цяпер — па 1400. Павышэнне цаны адбіваецца на збожжы, на мясе — на ўсім".*

Анатоль ГАТОЎЧЫЦ.

СІТУАЦЫЯ

Адаптацыя да смерці

З 1 студзеня 2008 года індывідуальныя прадпрымальнікі будуць мець права наймаць на працу не больш за трох чалавек з ліку членаў сваёй сям'і і блізкіх сваякоў.

Прадпрымальнікі лічаць: гэта будзе канец індывідуальнаму прадпрымальніцтву.

У Беларусі працуюць 190 тысяч індывідуальных прадпрымальнікаў, разам з наёмнымі работнікамі армія ІП налічвае да паўмільёна чалавек. Куды ісці ўсім гэтым людзям?

Прадпрымальніцкія структуры аб'явілі поўную гатоўнасць да вясновых масавых выступленняў.

Намеснік міністра эканомікі Андрэй Тур звярнуўся ў прадпрымальніцкія структуры з просьбай падаць прапановы *"по безболезненной адаптации индивидуальных предпринимателей в новых условиях работы".* Адпаведны план рыхтуе Мінэканомікі сумесна з Міністэрствам па падатках і зборах. Але Беларускі саюз прадпрымальнікаў на чале з Аляксандрам Патупам перакананы: *"безболезненная адаптация"* немагчымая; *"магчымая толькі эскалацыя канфлікту".* Выхад з тупіка адзін — тэрміновая адмена злашчаснага ўказа.

Да 2003 года індывідуальны прадпрымальнік меў права наймаць наёмных работнікаў у маштабах малога прадпрыемства, а з 2003 года — меў права на трох наёмных рабочых. Згаданы ўказ пазбаўляе ІП нават гэтага, на падставе чаго БСП робіць выснову, што ідэя нарматыўнага акта накіравана *"на знішчэнне рэальнага мікрабізнесу ў краіне".*

"Магчыма, аўтар (аўтары) ідэі ўказа меў нейкія напрацоўкі наконт таго, як 190 тысяч індывідуальных прадпрымальнікаў (няхай толькі 100 тысяч з іх зацікаўленыя ў наёмных рабочых), цягам 2007 года зарэгіструюць свае звычайныя малыя прадпрыемствы, нанова атрымаюць свае ліцэнзіі, знойдуць 100 тысяч арандуемых памяшканняў, 100 тысяч галоўных бухгалтараў, наноў аформяць арэндныя адносіны на гандлёвыя месцы і пераадолеюць яшчэ шэраг сур'ёзных бар'ераў. Пры прапускной сістэме нашых рэгіструючых органаў у межах 8—10 тысяч прадпрыемстваў на год — па аптымістычных ацэнках, і на фоне масавай перарэгістрацыі дзеючых прадпрыемстваў у сувязі са зменамі ў Законе "Аб гаспадарчых таварыствах". Згаданыя аўтары мусілі б падзяліцца з дзяржавай і грамадствам рэцэптамі. Мы маем абгрунтаванае падазрэнне, што такіх рэцэптаў проста не існуе", — зазначыў Аляксандр Патупа.

Беларускі саюз прадпрымальнікаў збіраецца настойваць на адмене пункта 1.1 указа і прапануе шэраг мер па аздараўленні малога бізнесу, які застаўся *"апошнім рэзервам рэальнай эканомікі".*

Але ці збіраецца ўлада слухаць прадпрымальнікаў? Вось у чым пытанне.

Георгій ГЛЕБУСЬ.

ЧУЛІ?

Спіс невыязных

У Беларусі да 1 верасня будзе створаны "чорны спіс" невыязных асоб.

У яго патрапяць тыя, хто мае даўгі пасля судовых рашэнняў або былі прыцягнутыя да крымінальнай адказнасці. Сюды ж уключаць і службоўцаў, якія валодаюць дзяржаўнымі сакрэтамі, выдаванне якіх можа нанесці страту нацыянальнай бяспецы краіны. Напрыклад, лідэр апазіцыі Аляксандр Мілінкевіч быў аштрафаваны за спробу перасячы мяжу па дакументах сына. Ён адмовіўся плаціць штраф і цяпер мае запазычанасць перад судовай сістэмай — адпаведна за мяжу можа больш і не патрапіць. Адмаўляюцца плаціць празмерна вялікія штрафы і многія ўдзельнікі акцый пратэсту. Значыць, і яны не змогуць выехаць за мяжу.

Банк часова невыязных патрэбны для таго, каб адмовіцца ад дазвольнага штампу ў пашпарце, без якога сёння немагчыма пераехаць мяжу. Канстытуцыйны суд прыняў рашэнне скасаваць штамп да 31 снежня 2007 году. Летась з 600 тысяч беларусаў, якія звярнуліся ў аддзелы па грамадзянстве і міграцыі па дазвол на выезд за мяжу, адмоўлена было больш як 800 грамадзянам.

У Мінск прыязджае кароль

Як стала вядома, дасягнута дамоўленасць аб тым, што ў Мінск прыедзе неаднаразовы чэмпіён свету, ці як яго яшчэ называюць, "кароль" біятлона нарвежац Оле-Эйнар Б'ёрндален.

— Беларуская федэрацыя біятлона выйшла з прапановай да Б'ёрндалена аб тым, каб ён спланаваў свой прыезд у Беларусь, — паведаміў карэспандэнту "Народнай волі" дзяржтрэнер па біятлоне **Анатоль Бяляеў**. — На чэмпіянаце свету адбылася размова з менеджэрамі нарвежскага спартсмена, і, скажам так, мы знайшлі ўзаемаразуменне ў гэтым пытанні. Зараз будзем удакладняць тэрміны прыезду і фармат сустрэчы.

— Калі чакаць Б'ёрндалена ў Мінску?

— Пакуль гэтае пытанне абмяркоўваецца, аднак, безумоўна, гэта будзе перыяд, калі ў спартсмена не будзе ніякіх жорсткіх трэніровачных збораў. Думаю, што гэта будзе альбо вясной, альбо ў першай палове лета.

— Мэта запрашэння нарвежца?

— Сфармулюем, калі прыедзе; у нас некалькі варыянтаў. Галоўнае, што ён адгукнуўся, а далей — справа тэхнікі. Будзем удакладняць з самім Б'ёрндаленам, якую праграму ён хацеў бы "адкатаць" у Беларусі.

Алесь СІВЫ.

Павел РАДЗІВОНАЎ: «Такая мера будзе адпавядаць еўрапейскім мерам бяспекі...»

"Пракуратура мае намер ініцыіраваць увядзенне ў Беларусі адміністрацыйнай адказнасці за выкарыстанне летняй рызіны на аўтамабілях у зімовы час, — *заявіў днямі на прэс-канферэнцыі намеснік кіраўніка аддзела па наглядзе за захаваннем правоў і свабод грамадзян Пракуратуры Рэспублікі Беларусь* ***Павел Радзівонаў***. — Такая мера будзе адпавядаць еўрапейскім стандартам бяспекі".

Марына КОКТЫШ.

РЕГИОН

На Брестчине ищут янтарь

Республиканское унитарное предприятие "Белгео" приступило к работам по разведке отложений янтаря и определению его залежей в коренных палеогеновых пластах ряда районов Брестской области. Об этом корреспонденту БЕЛТА сообщили в департаменте по геологии Министерства природных ресурсов.

Конечной целью исследования станет оценка отложений, где, возможно, находятся первичные россыпи янтаря, и определение перспектив промышленной добычи этого камня. Кстати, первые попытки разведки месторождений янтаря в Брестской области были предприняты в 1983 году. Найденный белорусский янтарь по внешнему виду ничем не отличается от балтийского и используется в ювелирном деле.

В городе над Бугом сочиняют гимн

В горисполкоме работают комиссии по рассмотрению музыки и текстов гимна города Бреста. На сегодняшний день в работу поступило шесть вариантов авторства брестчан.

Как сообщила директор методического центра отдела культуры горисполкома Светлана Глушинская, уже состоялось заседание литературной и композиционной комиссии, где было высказано мнение, что гимн города должен быть написан на белорусском языке. Авторы шести предложенных вариантов не разглашаются, все тексты и ноты зашифрованы. Светлана Глушинская заметила, что на предложение написать гимн города откликнулись в основном непрофессиональные авторы. К слову, одному из композиторов всего 15 лет.

Директор методцентра заметила, что в горисполкоме ждут предложений брестчан до 30 марта, сообщает газета "Вечерний Брест".

Алексей ЖУРАВЛЕВ.

СПЕЦЫЯЛЬНЫ РЭПАРТАЖ

У Смаленск за «Народнай воляй»

Вось ужо год і пяць месяцаў "Народная воля" вымушана друкавацца ў Смаленску. Адпаведна, грошы, якія маглі б трапіць беларускім паліграфістам, дастаюцца расійскім. Для рэдакцыі — дадатковыя фінансавыя страты, нерваванне: пройдзе тыраж праз мяжу альбо мытня па наводцы дзяржбяспекі затрымае яго на колькі гадзін, а то і дзён; атрымаюць чытачы газету ў час, альбо са спазненнем, ці не атрымаюць увогуле?

...За чарговымі нумарамі газеты разам з экспедытарамі ў Смаленск ездзіў карэспандэнт "Народнай волі". Каб раніцай быць на месцы, Мінск пакінулі а 12-й гадзіне ночы.

Гаспадар фургона — прыватны прадпрымальнік, сам сабе транспартная фірма. Ён і дырэктар, і кіроўца. Сам вядзе бухгалтэрыю, сам шукае заказы.

Разам з ім у кабіне (на ўсялякі выпадак) кіроўца-зменшчык. Кабіна не надта прасторная, хоць і разлічана на траіх, але без трэцяга ў ёй значна камфортней.

У дарозе бавім час узятымі з жыцця байкамі. Ад двух Саш я пачуў з дзесятак жахлівых шафёрскіх гісторый — рэкет на дарогах (крымінальнікі збіраюць "падатак" з кіроўцаў-замежнікаў на вачах міліцыі нават на вуліцах Масквы), "пярэваратні ў пагонах", мытны "беспредел". Бяспека на дарогах — тэма хвалюючая. Па словах гаспадароў машыны, сустрэчы з крымінальнікам на трасе калі-нікалі могуць мець для кіроўцаў нават лятальны канец. Адзін з Сашаў распавядаў, як на гэтай вось дарозе, ужо на расійскай тэрыторыі, у яго скралі грошы (і немалую суму), калі ён спаў у кабіне. І меў жа ён глупства крыху не даехаць да спецыяльнай стаянкі, дзе начуюць фуры і грузавікі...

Праз гадзіну-другую спыняемся ля шлагбаума. Плацім за карыстанне дарогай, едзем далей. Увогуле, згадваюць кіроўцы, ад Брэста да мяжы з Расіяй такіх шлагбаумаў чатыры. Для мяне дзіўна, што плаціць гэты падатак павінны не толькі замежнікі, але і беларускія кіроўцы.

На пачатку чацвёртай гадзіны ночы мы на дзяржаўнай мяжы. Гэта тое месца, дзе калісьці Аляксандр Рыгоравіч з Віктарам Чарнамырдзіным выкопвалі памежны слуп. Планавалася, што ў гэтым палітычным хэпенінгу ад Расійскай Федэрацыі возьме ўдзел прэзідэнт Барыс Ельцын, але як дайшло да справы, той адмовіўся — маўляў, "не царское это дело!". Рыгоравіч тады яшчэ грозна заявіў, што той, хто зноў паставіць тут слуп, будзе мець справу непасрэдна з ім! Відаць, добра напалохаў, бо слупа няма дагэтуль — хоць усімі астатнімі атрыбутамі дзяржаўнасці мяжа паступова абрасла з абодвух бакоў. Прычым абрасла так густа, што за капітальнымі і часовымі пабудовамі згаданых служб не відаць узведзенага ў часы інтэграцыйнай гарачкі "манумента дружбы", аздобленага расійскім трыкалорам і чырвона-зялёным сцягам Аляксандра Лукашэнкі.

Машыны розных катэгорый праходзяць праз розныя тэрміналы. Наш фургон праляцеў мяжу хутка. У гэты тэрмінал чаргі фактычна не было. А вось усялякія грузавікі і фуры (катэгорыі "С", "D", "Е") стаяць у чарзе на некалькі кіламетраў. Тая ж карціна і з расійскага боку. Можаце ўявіць карціну: мароз пад трыццаць, дызелі не глушацца — загазованасць наваколля такая, як быццам стаіш у пробках мегаполісаў.

Хлопцы згадваюць, што яшчэ адносна нядаўна ім самім у чарзе на мытны ды іншы кантроль даводзілася стаяць па 3—5 гадзін. Было гэта падчас рэзкага абвастрэння "братэрскіх" стасункаў Беларусі і Расійскай Федэрацыі, Аляксандра Рыгоравіча і Уладзіміра Уладзіміравіча.

Праходзім неабходныя працэдуры і мы ўжо на расійскім баку. 50 расійскіх рублёў плацім за знаходжанне ў зоне іхняга транспартнага кантролю. Яшчэ 200 трэба плаціць за афармленне мытнай дэкларацыі. Але можна і не плаціць, калі, напрыклад, загадзя нарабіць адпаведных бланкаў на ксераксе. Але расійскія мытнікі такога вынаходніцтва не вітаюць (хоць і афіцыйнай забароны на гэта няма), справядліва мяркуючы, што гэта замах на іхні законны прыбытак. То іхні камп'ютэр "самапальныя" бланкі не чытае, то яшчэ штосьці не так. Так што іншым разам трэба прадэманстраваць характар, каб не расстацца без

дайпрычыны з 200 RUR (недзе 7—8 USD).

Запраўляцца ў Расіі танней, чым у Беларусі. Калі я правільна зразумеў маіх спадарожнікаў, на аўтазаправачных станцыях Расіі забаронена адпускаць за раз болей 200 літраў. Але, па іх жа словах, гэтае правіла паўсюдна парушаецца. Напрыклад, кіроўцы фур з Польшчы (на шафёрскім жаргоне "паны") без праблем бяруць па тысячы літраў. У бензабак і ў каністры "пра запас". Трэба думаць, у кошт аплаты паліва ў такім выпадку ўваходзіць і своеасаблівы падатак за рызыку.

Адлегласць ад мяжы да Смаленска наш фургон пераадольвае прыблізна за дзве гадзіны. Першае, што адчуваеш за ўсходняй мяжою: у Беларусі дарогі лепшыя. І яшчэ дзіўна бачыць на ўзбочыне дарогі прысыплены снегам бронетранспарцёр. Нібыта гэта блокпост дзе-небудзь у Чэчні. Адзін раз нас спыняе міліцыя на ўездзе ў Смаленск, другі — на гарадской украіне. Абодва разы аднолькавае пытанне: ці не вязём чаго-небудзь забароненага? Забароненае — гэта ўсё, што не задэкларавана, і яшчэ тавары з трэціх краін. У нас у гэтым сэнсе праблем няма, бо мы ўвогуле нічога не вязём.

На пачатку шостай гадзіны ночы спыняемся ля невыразнага, але акуратнага трохпавярховага будынка з сілікатнай цэглы — ТАА "Типография Михайлова". Паводле дамовы з друкарняй тыражы "Народнай волі" і газеты ПКБ "Товарищ" мусяць быць гатовыя да пагрузкі ў 5.20 па нашым часе (6.20 — па-маскоўскім). Але нас чакае аблом. Грузіць няма чаго, бо яшчэ не надрукавана. Калі надрукуюць — невядома. Нам прапаноўваюць пачакаць. Чакаем гадзіну, дзве... Каб не марнаваць час, спрабую чытаць кнігу, якую прыхапіў у дарогу. Да друкарні пад'язджаюць і ад'язджаюць загружаныя легкавікі, аўтафургоны, грузавікі. Нашага заказу ўсё яшчэ няма. Стомленыя дарогаю, мы не маем ні сіл, ні жадання сварыцца. Саша, які ўсю дарогу вёў машыну, уладкоўваецца на спальным месцы. Другі Саша і я спім на сядзеннях. Радыёпрыёмнік не выключаем, і нас люляе "Русское Радио".

Каля 10 гадзін раніцы (11 па-іхняму) нас радуюць навіною, што тыраж "Товарища" ўжо надрукаваны, а "Народная воля" друкуецца. Праз гадзіну, нарэшце, загружаемся.

Пакуль ідзе загрузка, я маю магчымасць паглядзець вытворчасць, прайсціся па цэхах. Уражвае. У Беларусі, наколькі мне вядома, такіх вялікіх друкарняў у прыватных руках няма.

На шашу выязджаем не тым шляхам, што прыехалі, а праз горад. У Смаленска цудоўны ландшафт і шмат аўтэнтычных помнікаў даўніны. У гэтым сэнсе ён можа даць фору Мінску, дзе многія гістарычныя будынкі — не больш як муляжы, адноўленыя ад падмуркаў па старых малюнках і фатаграфіях. Але непрыемна ўражвае недагледжанасць, занядбанасць цэлых раёнаў і вуліц Смаленска. Тут ужо мы можам даць фору Расіі. Фактычна Смаленск для Расіі тое ж, што для Беларусі Брэст. Першы вялікі горад ад мяжы, гэткая візітоўка краіны. Гэтая акалічнасць вымагае асаблівага клопату аб ягоным іміджы. Але ў адрозненне ад нашага Брэста візітоўка Расіі зашмальцаваная. Магчыма, гэта тлумачыцца тым, што расійцы яшчэ не звыкліся з відавочным фактам, што Смаленск ужо даўно не "ў самым цэнтры Расіі"; што іхняя дзяржаўная мяжа знаходзіцца літаральна побач з гэтым горадам. Мабыць, яны, паводле завядзёнкі часоў імперыі СССР, па-ранейшаму лічаць брамай сваёй краіны наш Брэст.

Прымач у нашай машыне настроены на хвалю, на якой перамаўляюцца, абменьваюцца інфармацыяй кіроўцы. Гаворка ўсё болей пра курсы валют і надвор'е. Часта гучыць слова "канвой". Гэта пра беларускіх службоўцаў, якія суправаджаюць расійскія грузы, што ідуць праз Беларусь. Вось і яшчэ адна праява мытнай вайны паміж краінамі. Мы не верым расійцам, яны не вераць нам. Дзіўна, што шафёры (людзі збольшага інтэлігентныя), калі лічаць, што іх ніхто не чуе, лаюцца па рацыі матам, нібы якія амапаўцы.

Зноў спыняемся на той жа заправачнай станцыі. Хлопцы гавораць, што ў кавярні пры гэтай АЗС можна смачна і танна (недзе за 100 расійскіх рублёў) пад'есці. Звяртаю ўвагу на праваслаўную капліцу побач з тэрміналамі. Пабудова зусім новая. На першы погляд не да месца і зусім не функцыянальная. Але, калі падумаць, насамрэч патрэбная. У доўгай дарозе нялішне калі-нікалі Бога згадаць. Асабліва, калі хвіліну таму бачыў на шашы перакуленую машыну, а побач міліцыянтаў і ўрачоў з "хуткай дапамогі".

Мяжу праходзім без праблем і зноў-такі даволі хутка. Гэтым разам наш груз не выклікаў цікаўнасці мытнікаў і памежнікаў. Па словах маіх спадарожнікаў, "Народная воля" на мяжы — выданне даволі папулярнае. Згадваюць, што даволі часта службоўцы па абодва бакі мяжы, даведаўшыся, што вязуць "Народную волю", пытаюцца: "Пачытаць што ёсць?" І тут жа забіраюць з палову пачка нібыта для нейкага кантролю.

Днём чарга з грузавікоў і фураў значна даўжэйшая, чым была ноччу. Шмат машын з польскімі і літоўскімі нумарамі.

На мяжы Мінскай вобласці, на аўтобусным прыпынку наша машына спыняецца. Нас чакае мясцовы жыхар — валанцёр, які развозіць газету па наваколлі. Бярэ некалькі пачкаў. На снягу ягоны ровар выглядае крыху недарэчна.

Перамаўляемся па мабільніках з рэдакцыяй. У нас цікавяцца, калі будзем на месцы, каб ведаць, на які час выклікаць брыгаду, якая будзе рыхтаваць газеты для рассылкі тым, хто робіць перадаплату за будучыя нумары. Тэлефануюць нам і з "Товарища", каб не забыліся, што ў іх цяпер новы адрас. З цэнтра горада "Товарища" прымусілі з'ехаць.

Везці апазіцыйныя газеты і не загаварыць пра палітычную сітуацыю немагчыма. Падчас размовы высвятляецца, што адзін з Сашаў у нядаўнім мінулым амапавец. Ён сведка і ўдзельнік леташніх сакавіцкіх падзей на Плошчы. Ягоная версія падзей адрозніваецца ад той, якую ведаюць чытачы "Народнай волі". Ён шчыра не разумее, чаго не хапала студэнтам — абаронцам намётавага гарадка. Саша, аднак, прызнаецца, што пераказвае чужыя словы, аповеды тых міліцыянтаў, якія нібыта непасрэдна "кантактавалі" з людзьмі на Плошчы. Ён у асноўным "разрульваў" транспарт. На свае ж вочы бачыў, як камунальнікі, якія прыйшлі на Плошчу пасля разгрому намётавага гарадка і арышту абаронцаў, займаліся марадзёрствам. Цягнулі ў кішэні рэчы з пакінутых рукзакоў і сумак, шакаладкі, бутэлькі з мінералкай, прадукты. Марадзёрствавалі на вачах замежнай прэсы, не саромеючыся... "Сорамна было за краіну", — гаворыць Саша.

...Шостая гадзіна вечара. Уязджаем у Мінск з боку Партызанскага праспекта. Вандроўка ў Смаленск і назад заняла больш за 17 гадзін. Разгружаюць машыну самі супрацоўнікі рэдакцыі. Дапамагаюць валанцёры, якія прыйшлі, каб узяць газеты для распаўсюджвання.

Ноччу газеты ўкладуць ва ўжо падрыхтаваныя канверты. А раніцаю мяхі з канвертамі звязуць на пошту. Большасць мінскіх чытачоў атрымае газету ў чацвер. У рэгіёнах — на дзень-другі пазней.

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ.

Народная Воля http://www.nv-online.info
16 ЛЮТАГА 2007 г.

Камунальныя плацяжы павысілі, а пра пенсію забыліся?

Звычайна са студзеня ці лютага павышалі пенсіі. Раслі тарыфы на камунальныя плацяжы ў сувязі з наступленнем халадоў і ацяпленнем, павышаліся і пенсіі, каб было чым разлічвацца за іх. Сёлета пакуль не было. Сказана толькі на сайце Міністэрства эканомікі, што сёлета сярэдняя пенсія па ўзросце павысіцца на 15,3—18,5 працэнта, у рэальным памеры — на 7,8—8,7 працэнта. Не багата. Ды і цэны будуць скакаць. Чыноўнікі тараторацъ: зробім усё, каб у выніку росту цэн на энерганосьбіты не пагоршылася жыццё грамадзян.

А яно пагаршаецца. Як паведамлялася ўжо, з пачатку года вырасла аплата за электраэнергію на 20 працэнтаў, ацяпленне кватэр — на 12 працэнтаў. У цэлым камунальныя паслугі падаражэлі на 5 долараў, больш як на 10 тысяч рублёў. Гэта значыць — мінус 10 тысяч з пенсій.

А днямі сталі расці цэны на тавары і прадукты. З 1 лютага на 10 працэнтаў выраслі цэны на шэраг імпартных тавараў. А іх жа завозілі і прадпрымальнікі. У іх і прадукты, і тавары значна таннейшыя, чым у дзяржаўных крамах. Іх часта купляюць пенсіянеры. Значыць, чарговы ўдар па пенсіі.

Асобна трэба сказаць пра лекі. Многія з іх не вырабляюць у Беларусі, таму завозяць з-за мяжы. Да таго ж замежныя — больш эфектыўныя. Іх падаражэнне негатыўна адаб'ецца на здароўі пажылых людзей.

Так што павышэнне цэн ужо істотна зменшыла пенсіі, а дакладней, іх пакупную магчымасць. Сумы засталіся ранейшыя, але купіць прадуктаў і паслуг можна ўжо значна меней.

Чыноўнікі працягваюць гаварыць пра свой клопат аб людзях, але іх словы не супакойваюць, а трывожаць. Бо заўважана, як толькі пачынаюць яны пра гэта гаварыць, чакай непрыемнасцяў.

Памятаеце, у самым пачатку года намеснік прэм'ер-міністра Уладзімір Сямашка гаварыў, што ў сувязі з ростам коштаў на энерганосьбіты гэта ніяк не адгукнецца на насельніцтве, у яго "ніякага шоку не будзе".

І следам павысілі кошт на электрычнасць на 20 працэнтаў, на цеплавую энергію — на 12 працэнтаў.

Днямі той жа Сямашка гаварыў, што абарона інтарэсаў насельніцтва будзе адным з прыярытэтаў урада ва ўмовах павышэння цэн на энерганосьбіты. І ў гэты самы ж час у магазінах перапісвалі цэннікі на шэраг імпартных тавараў і прадуктаў, якія павышаліся дзесьці на 10 працэнтаў. Магчыма, ва ўрадзе лічаць, што рост цэн абсалютна не цікавіць грамадзян, не з'яўляецца іх інтарэсам. Як і павышэнне пенсій. Калі яны застануцца ранейшымі, а цэны і тарыфы будуць расці, то шок у грамадстве будзе, прычым моцны.

Яўген ПАЎЛАЎ.

ЧУЛІ?

«Віцязь» мацнее і разумнее

На новую тэхналагічную вышыню, а заадно і да новых рынкавых заваёў зрабіў крок віцебскі тэлезавод "Віцязь" — галоўнае прадпрыемства аднайменнага вытворчага аб'яднання. Тут распачаты выпуск тэлевізараў на вадкіх крышталях. Новыя апараты з экранам у 34 см па дыяганалі функцыянальна не саступаюць імпартным прыёмнікам. На чарзе да канвеера — яшчэ дзве мадэлі з дыяганалямі экранаў 63 і 84 см. Гатовы да серыйнага выпуску і відэаплеер DVD з маркаю "Віцязя", і арыгінальны апарат для электратэрапіі, распрацаваны паводле навейшых медыцынскіх даследаванняў.

Сяргей БУТКЕВІЧ.

ПРОЧТИ И ЗАПОМНИ

Стирать и готовить будем ночью?

Правительство Беларуси установило дифференцированные по временным периодам тарифы на электрическую энергию для населения. Такое решение принято Постановлением Совета министров от 30 января 2007 года №116.

Согласно постановлению, 1 кВт/ч электрической энергии в оборудованных электрическими плитами жилых домах (квартирах) в зоне минимальных и максимальных нагрузок стоит 54,1 рубля и 162,3 рубля соответственно, 1 кВт/ч электроэнергии для нужд отопления и горячего водоснабжения с присоединенной мощностью оборудования более 5 кВт — 112,1 рубля и 336,3 рубля, а также 1 кВт/ч электроэнергии, за исключением перечисленных видов, стоит при минимальных нагрузках 74,7 рубля, максимальных — 224,1 рубля.

В выходные и праздничные дни тариф на электрическую энергию применяется в зоне минимальных нагрузок. Также установлены временные периоды зоны минимальных нагрузок: январь—март, октябрь—декабрь с 11.00 до 17.00 и с 20.00 до 8.00, апрель—сентябрь с 11.00 до 19.00 и с 22.00 до 8.00. Временными периодами зоны максимальных нагрузок являются январь—март, октябрь—декабрь с 8.00 до 11.00 и с 17.00 до 20.00, апрель—сентябрь с 8.00 до 11.00 и с 19.00 до 22.00.

Как видим, включать электроплиту и стиральную машину в привычное время уже не выгодно. За пользование электроэнергией в это время платить придется в три раза дороже, чем в более позднее или слишком раннее время. Так что варить и стирать те, кому не по карману новые цены на все услуги и товары, будут поздно вечером или ночью. Или в выходные и праздничные дни. В эти дни тариф на электрическую энергию применяется в зоне минимальных нагрузок. И на том, как говорится, спасибо.

Иван ВАСИЛЬЕВ.

ВЗГЛЯД ИЗ МОСКВЫ

Еще одна война?

Москва открывает новый фронт экономической войны с Беларусью — на этот раз в области международных автоперевозок. Российский Минтранс объявил, что прекратит выдавать белорусским автомобилистам разрешения на перевозку грузов из России в третьи страны и из третьих стран в Россию. Немедленного эффекта этот шаг иметь не будет. По сложившейся практике такие разрешения (на несколько тысяч поездок сразу) выдаются раз в два-три месяца. То есть до конца квартала белорусы смогут работать с теми документами, которые у них уже есть. Тем не менее этот вопрос теперь станет еще одним козырем России на экономических (а возможно, и политических) переговорах с властями соседней страны. В российской Ассоциации международных автомобильных перевозчиков (АСМАП) "Времени новостей" заявили, что отечественные автотранспортные фирмы полностью поддерживают ограничение деятельности иностранных коллег на территории России.

Непосредственным поводом для демарша Минтранса стал отказ государственного таможенного комитета (ГТК) Беларуси признавать документы таможенных органов Калининградской области России об уплате пошлин с товаров, следующих из Калининграда на "основную" территорию России через Литву и Беларусь. С 1 января (т.е. в разгар российско-белорусского газового и нефтяного конфликта) белорусская таможня приступила к досмотру всех таких грузов, а также стала требовать, чтобы перевозящие их автомобили пересекали страну в составе конвоев.

Конвоирование в данном случае не имеет ничего общего с заботой о сохранности грузов. Оно призвано защитить от них внутренний рынок (то есть гарантировать, что товары не будут разгружены и реализованы на территории Беларуси без уплаты местных таможенных пошлин). Конвойное сопровождение финансируется за счет самих перевозчиков.

Как пояснили "Времени новостей" в АСМАП, белорусский тариф за сопровождение составляет доллар за километр. На маршруте от Ошмянской таможни на белорусско-литовской границе до российской границы в районе Смоленска это выливается в 270 долларов (или 7500 российских рублей) с каждой фуры. Кроме того, перевозчики теряют время на самой Ошмянской таможне в ожидании формирования конвоя.

Конвоирование применялось белорусской таможней и раньше. Причем при перевозке от польской границы в Бресте в Смоленск из-за большего расстояния оно обходится еще дороже — примерно в 450 долларов с фуры. Однако товары, прошедшие таможенную очистку в Калининградской области, до сих пор были освобождены от этой процедуры согласно постановлению коллегии таможенного комитета союзного государства России и Беларуси от 2003 года. В АСМАП отказались от официальных комментариев, сославшись на отсутствие первых лиц ассоциации. В приватной беседе сотрудник ассоциации назвал действия белорусских властей "произволом", ответные шаги Минтранса России поддержал, а также напомнил, что АСМАП традиционно выступает за ограничение доступа иностранцев на российский рынок международных автомобильных перевозок.

Михаил КУКУШКИН.
"Время новостей".

ДВА ВЗГЛЯДА

Как живется бизнесу в Беларуси?

Какие же условия созданы для развития бизнеса в нашей стране?

Представители власти утверждают, что нормальные, независимые и международные эксперты указывают на наличие многих барьеров, тормозящих деятельность предпринимателей. Вот два взгляда на проблему.

Есть свой вектор

Правительство много говорит о поддержке частного бизнеса. Принимаются программы его поддержки, совершенствуется законодательство. Но независимые эксперты все равно утверждают, что условия развития бизнеса в Беларуси далеки от идеальных. Каковы дальнейшие планы правительства по улучшению бизнес-среды? Готово ли государство сделать еще один шаг навстречу частному предпринимательству? Об этих и других проблемах развития бизнеса в Беларуси корреспондент беседует с заместителем министра экономики ***Андреем ТУРОМ****.*

— Одним из препятствий на пути развития малого и среднего бизнеса предприниматели называют отсутствие среди них сильного лидера, который бы от их лица вел диалог с правительством. Как вы относитесь к подобной инициативе?

— Не вижу в этом смысла. Предприниматели и так являются членами правительственной комиссии. В описанном вами случае получится, что интересы огромного количества предпринимателей будет представлять один человек. При рассмотрении этого вопроса следует учитывать, что лицо, которое бы консолидировало всех предпринимателей, само по себе не будет являться предпринимателем. Это будет политическая фигура, функционер, а при таком раскладе возникают совершенно другие вопросы.

Кроме того, предприниматели, которые заняты, например, в сфере рекламного бизнеса, сталкиваются с абсолютно иными проблемами, нежели предприниматели, занятые, условно говоря, в сфере сельского хозяйства или на транспорте. Поэтому я считаю, что разговоры об объединении предпринимательского движения являются в большей мере политизацией проблемы.

— И вместе с тем у бизнеса есть огромное количество общих проблем. Например, в области налогообложения...

— Разумеется, то, что мы достаточно часто меняем законодательство и нормативную базу, является серьезной проблемой, с которой сталкивается абсолютно весь бизнес. Поэтому глава государства дал поручение в 2007 году сделать налогообложение прозрачным, простым и стабильным. Для этого нужно добиться того, чтобы в первую очередь налоговые органы не меняли своими инструкциями и подзаконными актами систему уплаты налогов.

— Среди проблем, о которых постоянно говорят предприниматели, есть также и сложности, связанные с выходом малого бизнеса на внешний рынок. Планируется ли для них снижение налогов на импорт?

— А почему они должны снижаться? Теоретики рыночной экономики постоянно говорят о необходимости равных условий конкуренции. Сейчас и так очень много вопросов задается по поводу того, что индивидуальные предприниматели, торгующие на рынках, платят единый налог, а юридические лица единого налога не платят. Налицо неравные условия налогообложения. В этом аспекте, на мой взгляд, следует вести речь о несколько иной форме налогового администрирования и ином механизме взимания налогов, стимулирующих выход субъектов малого предпринимательства на внешние рынки.

— Белорусское правительство по-прежнему продолжает ориентироваться на крупный бизнес?

— Конечно, правительство ориентируется на крупный бизнес, который является как бы основой всей экономики, но бизнес всегда есть бизнес, и выживает он благодаря развитию. Во время дискуссий о развитии предпринимательства в Беларуси принято сетовать, что крупный бизнес зажимает малый и средний, а ему в свою очередь помогает государство. Но надо понимать, что крупный и малый бизнес занимают различные ниши. Если мелкий бизнес лезет в сферы, в которых существует и должен существовать крупный, то у него все равно ничего не получится. В любом случае малые предприятия не будут производить автомобили, телевизоры, холодильники... У государства есть свой вектор, в развитии которого оно заинтересовано: есть определенные крупные производства, которые выпускают львиную долю валового внутреннего продукта, а также поставляют свою продукцию на экспорт. Разумеется, государство должно отслеживать эти сектора. Основное преимущество малого бизнеса в том, что он очень подвижный и перспективный и в состоянии заполнить свободные ниши, такие как торговля, "бытовка", различные сферы услуг. Они не могут конкурировать на одном поле, а только взаимодополнять друг друга.

На мой взгляд, среди направлений, по которым должен развиваться малый бизнес, можно отметить инновации. Сегодня в государстве их ставят во главу угла, а все разработки как раз базируются на поддержке малого инновационного бизнеса. В Беларуси эта ниша абсолютно не заполнена, но это самое перспективное направление. С точки зрения традиционных видов развития малого бизнеса это — развитие малых и средних городов. У нас нет приличных гостиниц, нормальной кухни в малых городах, инфраструктуры придорожного сервиса. Приведу простой пример. Пожалуй, главной достопримечательностью брестской трассы является зубр. Возле него постоянно останавливаются машины, фотографируются туристы... Но рядом с памятником нет даже минимальных бытовых удобств: негде перекусить, заправить машину, сходить в туалет. И таких "зубров" в Беларуси уйма, но для транзитной страны это непростительное упущение.

— Что делается для развития малого бизнеса?

— Как показывают отчетные данные, темпы прироста объемов производства субъектов малого бизнеса в полтора раза выше, чем у крупных предприятий. У частников уровень рентабельности всегда выше, чем в среднем по народному хозяйству.

Интересно, что в последнее время на 3-3,5 процента ежегодно увеличивается число юридических лиц. Также существенно возросли число и доля субъектов малого предпринимательства, занятого в промышленности, строительстве и на транспорте.

Наблюдается снижение доли малого предпринимательства в сфере торговли и бытового обслуживания. Это очень хороший показатель, так как он свидетельствует о том, что период первоначального накопления капитала заканчивается, а накопленные средства начинают входить в более стабильные, длительные по обороту виды деятельности.

— Какую перспективу вы видите для развития бизнеса в Беларуси на ближайшие годы?

— В любом государстве экономическое развитие предопределяет практически все сферы жизни. И когда я говорю о бизнесе, то подразумеваю всю экономику в целом. Те задачи, которые мы обозначили в программе социально-экономического развития до 2010 года, достаточно амбициозны. Ведь мы ставим себе задачу ежегодно прирастать на 9—10 процентов при среднем росте в мире 3 процента. Здесь имеется в виду развитие всего бизнеса в стране, а для малых предприятий будет открыто больше сфер для применения.

Екатерина ХАРИНА.

ЭКАНАМІЧНЫ СПАД

Ці паедзе трактар без паліва?

У сельскіх гаспадарках не хапае сродкаў для назапашвання паліва для вясенніх палявых работ

Што за дзіўнае, абсурднае пытанне, скажа чытач. Але менавіта яно стала цяпер модным у размовах механізатараў. На парозе вясна. У гаспадарках ідзе рамонт тэхнікі, варта турбавацца пра запас паліва. А вось яго і не хапае. Нягледзячы на бравурныя заявы чыноўнікаў.

Прэм'ер-міністр Сяргей Сідорскі, выступаючы на пасяджэнні прэзідыума Саўміна, заявіў, што ў краіне створаны спрыяльныя ўмовы для назапашвання дызельнага паліва да пачатку вясенніх палявых работ. Ён адзначыў, што ў краіне дастаткова дызельнага паліва і іншых нафтапрадуктаў, ёсць нават лішкі. Варта толькі заняцца іх назапашваннем у гаспадарках.

Сяргей Сідорскі падкрэсліў, што і цэны на іх прымальныя. Акрамя таго, на ўнутраным рынку на 60 працэнтаў зніжаны стаўкі акцызаў на нафтапрадукты, што стварае някепскія ўмовы для набыцця дызельнага паліва сельгасвытворцамі.

Зусім іншым было выступленне на тым пасяджэнні міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Леаніда Русака. Ён паведаміў, што прадпрыемствы Мінсельгасхарча прадпрынялі ўсе меры па назапашванні паліва да вясенняй пасяўной кампаніі. *"Але пакуль сур'ёзнага запасу няма"*, — канстатаваў міністр. Гэты яго агульны тэзіс пазней расшыфраваў яго намеснік Васіль Паўлоўскі. Па яго словах, для правядзення вясенніх палявых работ гаспадаркам неабходна 187 тысяч тон дызельнага паліва і 38 тысяч тон аўтамабільнага бензіну. На пачатак лютага ў сельскагаспадарчых арганізацыях запас дызельнага паліва склаў 6,2 тысячы тон і аўтамабільнага бензіну — 1,8 тысячы тон. Словам, кроплі. І гэта нягледзячы на тое, што *"прадпрыемствы Мінсельгасхарча прадпрынялі ўсе меры па назапашванні паліва да вясенняй пасяўной кампаніі"*. Дык у чым жа справа?

Адказ на пытанне з вуснаў міністра прагучаў так: *"Мы разлічваем, што, калі з'явяцца грошы з фонду падтрымкі сельгасвытворцаў, неабходнае назапашванне нафтапрадуктаў мы зробім"*. Словам, будуць грошы — будзе і паліва. Міністр таксама паведаміў, што сёлета з таго фонду сялу выдзяляецца 2,2 трыльёна рублёў.

Пра адсутнасць сродкаў гаварыў і намеснік міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Васіль Паўлоўскі. Калі летась тона дызельнага паліва каштавала 970 тысяч рублёў, дык сёлета — 1,5 мільёна. Нафтапрадукты падаражэлі ў паўтара раза. БЕЛТА паведамляе, што, па словах намесніка міністра, складанасць заключаецца ў тым, што льготных цэн на дызельнае паліва для сельскагаспадарчых арганізацый у сёлетнюю пасяўную не будзе. Паліва будзе набывацца па дагаварных цэнах. З улікам новых цэн на нафтапрадукты гаспадаркам патрэбна 420 мільярдаў рублёў. Дэфіцыт сродкаў складае 298 мільярдаў рублёў. Таму гаспадаркі вышукваюць сродкі для набыцця паліва з розных крыніц.

Ён не называе гэтыя крыніцы, але вынікі назапашвання паліва, аб якіх сказана вышэй, сведчаць, што пошук той пакуль малаэфектыўны. Спадзяванні на бюджэтны заём у памеры 70 мільёнаў долараў. Аб ім хадайнічае Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання перад кіраўніком дзяржавы. *"Гаспадаркі вельмі спадзяюцца на гэты бюджэтны заём і гатовы разлічыцца з ім ва ўстаноўленыя тэрміны"*, — падкрэсліў намеснік міністра.

Відаць, гэтай сумы заёму не хопіць. Бо далей спадар Паўлоўскі зазначыў, што астатняя сума на паліва будзе накіравана з абласных бюджэтаў, уласных сродкаў гаспадарак і дапамогі спонсараў.

Грошы патрэбны не толькі на паліва, але і для закупкі ўгнаенняў. У краіне дэфіцыт фосфарных угнаенняў, якія неабходна набываць за мяжой. Грошы патрэбны і іншым галінам народнай гаспадаркі. Але дзе іх узяць? Рэзкі рост коштаў на расійскія газ і нафту нішчаць беларускую казну.

Аб беднасці казны, адсутнасці сродкаў сведчыць выступ прэм'ера Сяргея Сідорскага на калегіі Мінфіна краіны. Ён паставіў задачу прыцягнуць сёлета 1,5 мільярда долараў знешніх займаў. Пры гэтым даручыў Мінфіну ўжо ў сакавіку знайсці не менш за 500 мільёнаў долараў, перадае "Інтэрфакс". Тут жа спадар Сідорскі нагадаў, што летась Мінфін не змог забяспечыць запланаваны аб'ём прыцягнення знешніх рэсурсаў у памеры каля 450 мільёнаў долараў. Тут паўстае пытанне: калі летась за год не змаглі знайсці 450 мільёнаў, дык як цяпер за месяц выйдуць на большую суму?

Аб адсутнасці сродкаў сведчаць і ўскосныя факты. На той жа калегіі Мінфіна прэм'ер гаварыў, што ўрад прыняў рашэнне аб забароне выкарыстання ўнутраных бюджэтных сродкаў прадпрыемствамі, калі яны маюць магчымасць прыцягнуць знешняе фінансаванне. Аб гэтым сведчыць рост цэн на імпартныя тавары і тарыфаў на камунальныя паслугі. Трэба ж папаўняць казну. А пакуль яна не напоўнена, не могуць быць напоўненыя палівам і бакі трактароў.

Яўген ТАЎГЕНЬ.

ЯК ЖЫЦЬ?

На вуліцы зіма. А цэны ўжо «плывуць»

Дэбют цэнавых скачкоў прыйшоўся на 19 студзеня гэтага года, калі ў другой палове дня на мінскія запраўкі паступіў загад канцэрна "Белнафтахім" аб тым, што падымаюцца аптовыя цэны на нафтапрадукты, якія адгружаюцца канцэрнам, а таксама рознічныя цэны на нафтапрадукты, якія рэалізуюцца праз аўтазаправачныя станцыі (апошні раз бензін даражэў 12 снежня мінулага года).

Такім чынам, цэны на бензін выраслі ў сярэднім на 5 працэнтаў. А-76 стаў каштаваць 1470 рублёў за літр (рост 5%), А-92 — 1840 (4,5%), А-95 — 2100 (5%), дызельнае паліва — 1470 рублёў (5%).

Тым не менш афіцыйныя асобы заклікаюць народ не хвалявацца. Як заявіў, падводзячы вынікі маскоўскіх перамоў па пастаўцы і траспарціроўцы расійскай нафты, віцэ-прэм'ер **Андрэй Кабякоў**: *"Не запланавана павышэнне цэн на нафтапрадукты, якое не суадносіцца з прагнозам. А мы прагназуем на 2007 год інфляцыю ў межах 6—8 працэнтаў, і ў гэтыя параметры павінны ўвайсці цэны на нафтапрадукты"*. Калі верыць спадару Кабякову, то да канца 2007 года "люфт" для павышэння застаўся зусім маленькі.

"Прадугледжваецца, што рост цэн у 2007 годзе не перавысіць 6—8 працэнтаў", — паабяцаў 15 студзеня Аляксандру Лукашэнку і старшыня Нацыянальнага банка Беларусі **Пётр Пракаповіч.** Але такія абяцанні — тое ж, што паказчык сярэдняй тэмпературы хворых па бальніцы.

Напрыклад, словы спадара Пракаповіча не суадносяцца з заявай генеральнага дырэктара "Белтопгаза" **Леаніда Рудзінскага**, які на пасяджэнні калегіі Мінэнерга ў Гродне паведаміў грамадскасці, што дзяржаўнае вытворчае прадпрыемства "Белтопгаз" лічыць неабходным у 2007 годзе павысіць цэны на торфабрыкет для насельніцтва на 10 працэнтаў.

І калі павышэнне цэн на торф пакуль толькі плануецца, то мінчане з 1 лютага паспелі адчуць увесь "смак" новай цэнавой палітыкі. Менавіта з гэтага дня ўступіла ў сілу рашэнне Мінскага гарсавета ад 30 снежня 2006 года, па якім падатак з продажу імпартных тавараў вырас з 5 да 15 працэнтаў, а, суадносна, і імпартныя тавары падаражэлі ў сярэднім на 10 працэнтаў — як прамысловыя, так і прадукты. На 5 працэнтаў падаражэлі толькі скураны абутак, натуральнае футра, мяса і птушка, каўбасныя вырабы, кансервы мясныя, малако і малочныя вырабы.

Цікава, што ў многіх крамах цэннікі застаюцца старымі, але прадаюць людзям тавар ужо па новых расцэнках.

Але і гэта не ўсё! Акрамя імпарту падаражэлі яшчэ і айчынныя паслугі. Як, напрыклад, у цырульнях.

"Нам толькі 12 лютага паступілі паперы аб павышэнні цэн на паслугі, — кажуць мне ў сталічным салоне "Надзея", што на вуліцы Слабадской. — *З гэтага дня і наступае ў нас павышэнне цэн — на 5 працэнтаў"*.

Падаражэлі таксама паслугі мабільнай сувязі...

"Падатак у нас існуе ўжо не адзін год, яго ўстанаўліваюць мясцовыя органы самакіравання, — тлумачаць у кампаніі мабільнай сувязі **"Velcom"**. — *Аднак з 1 лютага ён змяняўся. У Мінску быў падатак пяць працэнтаў — стаў дзесяць. У Мінскай вобласці як быў дзесяць працэнтаў, так і застаўся, у Брэсце застаўся на ўзроўні 7 працэнтаў. У Гомелі з 7 працэнтаў вырас да 10, у Віцебску застаўся на ўзроўні 10 працэнтаў, у Гродне — на ўзроўні 5 працэнтаў. У Магілёве павялічыўся на 5 працэнтаў (да дзесяці). Абаненцкая плата, як і тэлефонныя званкі, мае фіксаваны кошт, аднак яны абкладаюцца падаткам, які, такім чынам, шмат дзе павялічыўся. Так што плаціць прыйдзецца крыху больш"*.

Акрамя ўсяго іншага, згодна з рашэннем Мінгарсавета, павялічыліся з 5 да 10 працэнтаў падаткі на паслугі гасцініц (кемпінгаў, матэляў), рэстаранаў (бараў, кафэ), аўтасервісаў (па тэхнічным абслугоўванні і рамонце транспартных сродкаў для фізічных асоб), більярдных, боўлінг-клубаў, дыскатэк, салярыяў, на касметычныя і турыстычныя паслугі (за выключэннем паслуг па ўнутраным і ўязным турызме). Самі па сабе ("расійскі газ падаражэў") узвінчваюцца цэны і на будаўнічых рынках...

"Там цэны падымаюцца, што называецца, "пад шумок", — мяркуюць эксперты будаўнічага рынку. — *Пакуль нельга адназначна сказаць пра агульнае павышэнне цэн на будаўнічыя матэрыялы, таму што пакуль прадаецца тавар, які быў закуплены яшчэ ў мінулым годзе. Цэмент, напрыклад, ідзе па квотах, таму яго кошт стабільны, ёсць у людзей запасы цэглы, і яе зараз можна нават танней купіць, чым у самога вытворцы. Аднак прагназуецца, што і той жа цэмент ды цэгла падаражэюць на 40—60 працэнтаў, бо іх вытворчасць даволі энергаёмістая. І паціху будзе даражэць... усё. Сезон жа будаўнічы яшчэ не пачаўся, а вось недзе ў красавіку цэны могуць пайсці ўверх"*.

Дарэчы, нельга гарантаваць, што мы пералічылі ўсе катэгорыі тавараў, цэннікі на якія змяніліся. Навіны прыходзяць кожны дзень. І ў гэтым сэнсе сітуацыя зрушылася. Толькі адно пакуль застаецца стабільным — зарплаты і пенсіі, на якія пражыць усё цяжэй і цяжэй.

Алесь СІВЫ.

Шанс для перемен?

В Туркмении состоялись президентские выборы.

"Туркмения переживает важный исторический момент. У страны появился шанс для перемен к лучшему, к уважению прав человека и проведению реформ. И мы надеемся, что избранный президент порвет с репрессивным наследием прошлого", — сказала в интервью Радио Свобода представитель "Международной амнистии" Анна Сандер-Плассман.

Однако, по мнению международных наблюдателей, нынешние выборы в стране вряд ли можно назвать справедливыми. Председатель межпарламентской делегации Евросоюза по наблюдению за выборами в Туркмении Альберт Ян Маат считает: *"Эти выборы, в которых участвовали только представители бывшего правительства страны, нельзя назвать соответствующими демократическим нормам. И это не самое лучшее начало для строительства открытого общества".*

Лидеры туркменской оппозиции в изгнании заявляют, что власти Туркмении сфальсифицировали данные о рекордной явке избирателей на выборах президента.

Как рассказал в интервью радиостанции "Эхо Москвы" лидер оппозиционного движения "Ватан" Худайберды Оразов, у него есть много свидетельств того, что активность избирателей была во много раз ниже, чем об этом объявляет ЦИК.

"Ниязовская система работает и без самого Ниязова", — заявил проживающий в Швеции Оразов. По его мнению, президентские выборы при отсутствии реальной альтернативы, независимых наблюдателей, а также продолжающихся нарушений прав и свобод человека, нельзя считать легитимными.

Напомним, что, согласно данным туркменского ЦИК, на состоявшихся выборах проголосовали почти 99 процентов жителей республики, имеющих право голоса.

Ряд туркменских оппозиционеров выступает с примирительными заявлениями и надеется на перемены к лучшему при новом главе государства.

"Несмотря на все сложности и замечания по выборам, все говорит о том, что после них относительные перемены к лучшему начнутся", — заявил в Москве один из лидеров оппозиционной Республиканской партии Туркмении Байрам Шихмурадов, сын отбывающего в Туркмении пожизненное заключение экс-министра иностранных дел Бориса Шихмурадова. *"Мы сейчас не ставим вопрос о борьбе за власть. Наша основная задача — каким-то образом оказаться вовлеченными в политический процесс в Туркмении",* — сказал он.

Андрей РУСАКОВИЧ.

ГОРЯЧАЯ ТЕМА

Чем Путин шокировал мюнхенскую аудиторию?

В столице Баварии — Мюнхене — на ежегодной Международной конференции по вопросам безопасности приняли участие 270 высокопоставленных политиков из 40 стран. Впервые на ней побывал президент России Владимир Путин и выступил с речью, которая вызвала широкий резонанс в политических кругах. В ней он остро критиковал США и НАТО, в общем, говорил об известном. Так чем же так удивила его речь?

Поскольку ее пересказали российские телеканалы, а некоторые наши государственные СМИ увидели в ней чуть ли не повторение Путиным белорусских взглядов, то мы остановимся на реакции на нее в мире.

Жестко на нее отреагировали представители США. Сенатор-республиканец Джон Маккейн расценил выступление Путина как "самую агрессивную речь российского лидера с момента окончания холодной войны. А сенатор Джозеф Либерман назвал доклад российского президента "провокационным, звучащим как отголоски холодной войны.

На конференции в Мюнхене выступил министр обороны США Роберт Гейтс. Комментируя выступление Путина, он сказал, что оно "почти вызвало у него ностальгические чувства" по временам холодной войны. Пытаясь разрядить ситуацию, глава Пентагона пошутил, что "все шпионы говорят напрямую", подчеркнув, что имеет в виду и себя.

Говоря об отношениях НАТО с Россией, Гейтс сказал: *"Россия — партнер во многих отношениях, но иногда нас удивляет политика России, которая противоречит международной стабильности, — например, передача оружия, а также использование энергоресурсов для оказания давления".*

І тады хлопец вырашыў на колькі хвілін стаць акцёрам: ён пачаў імітаваць размову з дзяжурным аддзела міліцыі.

На гэты раз усё атрымалася! Злачынца, паверыўшы, што Андрэй выклікае аператыўнікаў, кінуўся бегчы. А выратаваная дзяўчына, якая аказалася нават маладзейшай за Андрэя, разам са сваім збавіцелем паспяшалася ў іншы бок — у міліцыю. Яны добра запомнілі прыкметы гвалтаўніка, і нягоднік неўзабаве быў затрыманы.

З улікам непаўналецця ахвяры замаху на гвалт злачынца пакараны пазбаўленнем волі тэрмінам на 5 год. А смеламу і дасціпнаму хлопцу Чыгуначны райаддзел унутраных спраў г.Віцебска аб'явіў падзяку ў афіцыйным дакуменце.

Сяргей БУТКЕВІЧ.

АСОБА

Паважаная "Народная воля"!

У публікацыі "Крамольны крыж" згадваецца імя святара Гадлеўскага, расстралянага гітлераўцамі ў лагеры смерці "Трасцянец" у 1942 годзе. Хацелася б больш падрабязна даведацца пра гэтага незвычайнага чалавека, нязломнага патрыёта Беларусі.

Андрэй РАБЧЫНСКІ.
Асіповіцкі раён.

Яўген ЦУМАРАЎ, гісторык

Агмень, запалены святасцю

Вінцэнт Гадлеўскі... Светлая згадка прадвесня незалежнасці Беларусі. Ён — з тых адраджэнцаў, якіх ідэя дзяржаватварэння адухаўляла рабіць годна ўсё, што выпадала на іх змагарніцкі лёс у той гістарычны прабег часу ад пачатку XX стагоддзя.

Тады беларуская супольнасць паклікала да жыцця ў няўтульнай для беларускай душы рэчаіснасці патрыятычныя групоўкі, якія год за годам стваралі грунт для масавага незалежніцкага руху. Гэты рух вырастаў у часы ад першай і да другой (уключна) акупацыі Беларусі, у час сусветных войнаў на мяжы непрымірымага супрацьстаяння з усімі ўладамі, якімі лёс "адарыў" беларусаў.

Сябра Рады Беларускай Народнай Рэспублікі ад красавіка 1918 года... Перакладчык (лепей — бібліядаўца) на сучасную беларускую мову "Новага Тэстаменту". Рэдактар "Крыніцы" (менскі перыяд выдання)... Заснавальнік друкарні Ф.Скарыны ў Вільні (1936 г.). Выдавец, рэдактар і адмысловы сааўтар часопіса "Беларускі фронт" (ад 1936 г.) і іншых. Аўтар кніг "Historyja Swiataja abo biblijanaya Staroga Zakonu" (Вільня. 1930 г.) "Historyja Swiataja Nowaha Zakonu" (Вільня. 1932 г.), "Палітычныя і грамадзкія кірункі ў мінуўшчыне і сучаснасьці" (Вільня, часопіс "Шлях моладзі"), а таксама шэрагу артыкулаў у віленскіх друкаваных выданнях 1920—1940-х гадоў, у тым ліку пад псеўданімамі В.Скальманоўскі, Стас з-пад Немна, ВАГ...

Паводле сведчання сучаснікаў, ён быў і захапляльны аратар. А да таго ж творца шматлікіх "незалежных" дакументаў: мемарандумаў, праграм, дакладаў, рэфератаў, дэкларацый і г.д. Публіцыстыка, як і дакументы важкага грамадскага зместу, з незвычайнай выразнасцю паказваюць не толькі розум, а і сэрца чалавека-грамадзяніна, дзяржаўнага мужа. І перадусім — святара, душпастыра свайго народа. Дарэчы, ягоныя біблейскія кнігі-пераклады 1930-га і 1932 гадоў — адзіныя пакуль выданні Старога і Новага Запавету, створаныя на даступнай кожнаму добрай беларускай мове.

Яго шырокая асветніцкая, грамадская і палітычная дзейнасць ішлі разам. У другой палове 1930-х Вінцэнт Гадлеўскі друкуе шэраг артыкулаў у часопісе "Беларускі фронт". Гэтыя невялікія па аб'ёме артыкулы так і просяцца на старонкі сённяшніх беларускіх выданняў: яны не страцілі сваёй гарачай актуальнасці ні на драбніцу. Іх лейтматыў — нацыянальная ідэя і самасвядомасць беларусаў, дзяржаўная незалежнасць Айчыны.

Гістарычныя крыніцы сведчаць, што В.Гадлеўскі і яго аднадумцы — ствол раскідзістага дрэва беларускіх незалежных арганізацый, якія вырасталі ў 1920-х — пачатку 1940-х гадоў на абсягах ад Віленскага краю і Заходняй Беларусі да Менска, Варшавы, Берліна, Прагі, Парыжа, Манчэстэра, Чыкага... Гэты самаарганізаваны рух прыкметна ўплываў на лёс Беларусі, адухаўляў нацыянальнай адметнасцю жыццё краю. І развіваўся нават пасля трагічнай гібелі святара ды многіх яго паплечнікаў.

Ад самага пачатку нават назвы тых галін незалежніцкага дрэва, у вырастанне якіх уклаў агмень душы і палітычны досвед айцец Гадлеўскі, выяўлялі ідэйную аснову, сэнс і канчатковыя мэты іх дзейнасці: Беларуская Хрысціянская Дэмакратыя (Менск — 1917 г., Вільня — ад пачатку 1920-х гадоў); ад 1918-га — Беларускае Народнае Прадстаўніцтва); Віленскі Беларускі Нацыянальны Камітэт (Вільня — ад 1921-га і да 1930 гг.); Беларускі Нацыянальны Фронт — БНФ (Вільня — ад 1936 г.); Беларуская Незалежніцкая Партыя — БНП (Вільня — 1939-ы, Варшава — 1940-ы, Менск — 1941—1942); Беларускі Нацыянальны Цэнтр (Берлін, Варшава, Прага і іншыя — ад 19 чэрвеня 1941 г.); Беларускі Вызвольны Рух (Менск, Берлін, Прага, Манчэстэр — ідэя ад 1942 г. — да зацвярджэння, ужо без яго, Маніфеста БВР у 1954 г. у Лондане).

...Існуюць навуковыя тэорыі стварэння свету, узрастання дрэва жыцця на зямлі ў выніку выбуховападобнага запачаткавання жывой матэрыі. Падобным выбухам для беларусаў на ўсё XX стагодзе стала ўтварэнне Беларускай Народнай Рэспублікі ў 1918 годзе. Уся ідэйна-палітычная моц беларускага незалежніцкага руху ў 1920—1940-х гадах грунтавалася на прэцэдэнце БНР, абвешчанай на аснове права нацый на самавызначэнне, дэклараванага нават бальшавікамі, і ў выніку распаду Расійскай імперыі.

Вымушаны былі лічыцца з ідэяй незалежнасці Беларусі і маскоўскія бальшавікі, напалоханыя ростам аўтарытэту БНР, і літоўскія нацыянальныя дзеячы у 1919—1923 гг., і нават нямецкія акупацыйныя ўлады.

...Але вернемся да вясны 1917 года. Тады сем асоб абіраюцца Менскімі беларускімі арганізацыямі для перамоў з расійскім Часовым Урадам. Сярод іх быў і святар Вінцэнт Гадлеўскі. Мелася абмеркаваць "федэратыўнае ўладкаванне дэмакратычнай Расеі". Ды перамовы не адбыліся, бо Часовы Урад імкліва страчваў уладу....

На жаль, ні тады, ні пазней яму не было наканавана ўбачыць ідэю незалежнай Беларусі рэалізаванай, але яна заўжды была ў яго душы як самае запаветнае. Прыехаўшы на радзіму ў 1941-м, ён з болем бачыў, як на акупаванай зямлі схліснуліся ў зацятай барацьбе збройныя і палітычныя сілы, агульныя ў адным: Беларусь ці яе асобныя абшары разглядаліся выключна як частка чужой "жыццёвай прасторы" — і ні ў якім разе не беларускай.

Беларускіх патрыётаў забівалі як немцы, так і вышкаленыя на "Вялікай зямлі" НКУСаўскія і СМЕРШаўскія атрады. На тых, хто неяк заявіў сябе ў нацыянальна-грамадскім жыцці, вялося сапраўднае паляванне савецкай і польскай "партызанкі". Патрыёты гінулі таксама ў засценках СД і нямецкіх канцлагерах, між іншым, нярэдка ў выніку правакацыйных даносаў. Пэўна, іх ахвярай і стаў Вінцэнт Гадлеўскі. Увосень 1942 года прагучаў яго заклік да беларускіх настаўнікаў: **"Трэба мяняць пяро на штык".** Гэта, відавочна, і каштавала яму жыцця, прысвечанага найсвятой справе — дзяржаўнай незалежнасці Бацькаўшчыны, якую ён хацеў бачыць вольнай і дэмакратычнай. Ён быў схоплены гестапаўцамі і закатаваны ў Трасцянцы. На месцы расстрэлу пакутніка за Беларусь сённяшнія ўлады не дазволілі асвяціць крыж...

Але памяць пра выдатнага чалавека не згіне, як не страцяць цікавасці і актуальнасці яго глыбокія публіцыстычныя творы, напісаныя даўно, а нібы — сёння. Бо напісаны агменем яго святой душы патрыёта.

Увазе чытачоў прапануецца адзін з яго артыкулаў (арфаграфія захоўваецца).

Вінцэнт ГАДЛЕЎСКІ

Што такое нацыяналізм?

У першым нумары "Беларускага Фронту" сёлета, пішучы на тэму: "Новагоднія разважаньні", мы адзначылі вялікую сілу нацыянальнай ідэі або т.зв. нацыяналізму. Мы тады сьцьвердзілі, што нацыяналізм зьяўляецца сяння вялікай дынамічнай сілай, якая нясе сьвету глыбокія палітычныя перамены. І запраўды, прыглядаючыся ўважна да сучасных падзеяў, ня толькі ў Эўропе, але ў Азіі, Афрыцы, мы прыходзім да выводу, што галоўным матэрам гэтых падзеяў ёсьць нацыяналізм.

Дык што такое нацыяналізм?

Нацыяналізм — гэта кірунак чалавечай думкі, якая імкнецца да ажыцьцяўленьня мэтаў, карысных для нацыі — народу. Значыць, першай і галоўнай падставай нацыяналізму ёсьць існаваньне народу (нацыі), а другой, каб гэты народ меў свае мэты. Ясна, што свае мэты можа мець толькі сьведамы народ. Бяз гэтых двух падставаў, гэта значыць, без існаваньня нацыі й без наяўнасьці мэтаў у гэтай нацыі, нацыяналізм немагчымы.

Мэты ў кожнай нацыі могуць быць розныя, і, залежна ад мэтаў, можа быць розны нацыяналізм. Гэтак — на першым пляне можна паставіць абарону нацыі ад загубы, інакш кажучы, ад нацыянальнай сьмерці. Гэтакую мэту мае той народ, якому пагражае асыміляцыя з боку мацнейшых народаў. У гэткага народу бывае **нацыяналізм абаронны.**

Іншай мэтай можа быць развой народу ў кірунку палітычным, эканамічным і культурным. Што датычыць разьвіцьця ў палітычным кірунку, дык нацыя, пранятая духам нацыяналізму, ідзе да здабыцьця для сябе роўных правоў зь іншымі народамі, да закладзінаў сваёй дзяржаўнасьці й да адыграньня сваёй ролі ў сусьветных падзеях; у эканамічным кірунку — да стварэньня як найлепшых умовінаў эканамічнага жыцьця для свайго народу, а ў культурным — да разьвіцьця літаратуры, навукі, мастацтва й усяго, што зьвязана з асьветай і цывілізацыяй. Гэта ёсьць **нацыяналізм творчы.**

Але ёсьць яшчэ іншы нацыяналізм, які зьяўляецца тады, калі адзін народ хоча падпарадкаваць сабе іншы народ. Гэта можа адбывацца або пры дапамозе сваіх культурных уплываў, або пры дапамозе сілы. Культурнае аддзеяньне аднаго народу на іншыя народы адбываецца тады, калі культура гэнага народу, ягоная літаратура, навука й мастацтва настолькі вялікія, што не прыняць іх немагчыма, а панаваньне пры дапамозе сілы адбываецца тады, калі сільнейшы народ забірае пад сваю ўладу слабейшы й стараецца яму накінуць сваю мову, культуру, а разам з гэтым сваю нацыянальнасьць. Гэта ёсьць **нацыяналізм імпэрыялістычны.**

Гэтак адрозьніваем нацыяналізм абаронны, творчы й імпэрыялістычны.

У абаронным нацыяналізьме знаходзім сьведамасьць нацыянальнай апрычонасьці і волю бараніць свой народ ад нацыянальнай сьмерці. Абаронны нацыяналізм выступае галоўна ў народаў падняволеных. Але абарону нацыі трудна было б правесьці без нацыянальнай творчасьці, а гэта дзеля той прычыны, што той народ, каторы толькі бароніцца, а нічога ня творыць, уканцы ня выдзяржыць і паддасца чужому народу. Можна сказаць з усёй упэўненасьцю, што народы, якія толькі бароняцца й

не выказваюць творчасьці, зьнікнуць з вобліку зямлі як нацыі. Значыць, **нацыя, баронячыся, павінна адначасна тварыць, разьвіваць свае нацыянальныя вартасьці, сваю мову, сваю літаратуру й мастацтва,** ідучы разам з гэтым да здабыцьця для сябе палітычных правоў, роўных зь іншымі народамі. Нацыя, якая б адказалася або не імкнулася да роўных правоў зь іншымі народамі, ня ёсьць поўнавартаснай нацыяй і не заслугоўвае на імя нацыі.

Творчы нацыяналізм кожнай поўнавартаснай нацыі вядзе тую нацыю да стварэньня сваёй **дзяржавы.** Гэта мы бачылі ў народаў: польскага, чэскага, латыскага і іншых. **Без сваёй дзяржавы нацыя ня мае свабоды, якая патрэбная да разьвіцьця творчых сілаў народу,** яго літаратуры, навукі, мастацтва, гаспадарчага жыцьця і г.д. Усебакова разьвіваць свае нацыянальныя вартасьці нацыя зможа толькі ў сваёй дзяржаве. Дый дзяржавы па Вялікай вайне паўставалі найбольш на нацыянальнай, а не на якой іншай падставе, добра, мусіць, разумеючы, што **нацыянальныя асаблівасьці (мова, нац. характар, звычаі) найболей лучаць і цымантуюць людзей.**

Гісторыя нас вучыць, што дзяржавы, зложаныя зь некалькіх нацыянальнасьцяў, развальваліся, а ня было выпадку, каб развалілася дзяржава, зложаная з адной сьведамай нацыі. Дык для дабра нацыі й дзяржавы трэба, каб гэтыя два паняцьці супадалі, творачы адно цэлае.

Для сутнасьці творчага нацыяналізму патрэбны: **сьведамасьць** сяброў данай нацыі аб сваім фізычным і псыхічным сваяцтве; **воля** падняцьця гэтай нацыі і зраўнаньня яе зь іншымі нацыямі; **праца** дзеля разьвіцьця нацыянальных вартасьцяў народу, яго мовы, літаратуры, навукі, мастацтва, а таксама падняцьця ягонага эканамічнага й палітычнага бытаваньня. Такога творчага нацыяналізму спыняць ніхто ня мае права, ані свой, ані чужы. Хто б спыняў, той грашыў бы супраць свайго або супраць чужога народу. Калі мы шануем правы адзінкі, дык яшчэ болей павінны шанаваць правы народу.

З усяго, што мы сказалі, вывад такі, што **нацыя без нацыяналізму існаваць ня можа**; што кожная нацыя мае свой арыгінальны нацыяналізм; што **кожны, хто працуе для дабра нацыі або бароніць яе, ёсьць у такім ці іншым сэнсе нацыяналістым.** Ды мы як запраўдныя нацыяналісты павінны кіравацца дабром сваёй нацыі.

"Беларускі Фронт", №3 (37), 1 лютага 1939 г., Вільня.

ПРОИСШЕСТВИЕ

Снайпер пинского масштаба

В Пинском районе произошло чрезвычайное происшествие, мотив которого правоохранительным органам еще предстоит выяснить. 50-летний житель деревни Пинковичи дважды разрядил охотничье ружье в окно детского сада.

Как сообщил корреспонденту БЕЛТА начальник Пинского РОВД Александр Масальский, звонок в милицию о разгуливающем по деревне мужчине с охотничьим ружьем поступил из местного строительного магазина, где "охотник" вызвал большой переполох.

На место происшествия немедленно выехала следственно-оперативная группа. Между тем мужчина, вооруженный ружьем, покинул магазин и разрядил гладкоствольку в окно расположенного неподалеку детского сада. Александр Масальский сообщил, что, по словам очевидцев, стрелял мужчина прямо из подъезда дома, в котором живет: выстрелил один раз, затем перезарядил ружье и снова нажал на курок.

Собеседник сообщил, что дальность полета дроби составляет порядка 130 м. Металлические шарики разбили наружное стекло в окне игровой комнаты одной из младших групп на втором этаже. Малыши как раз принимали пищу, когда с дребезгом распалось на куски стекло. К счастью, внутреннее стекло осталось неповрежденным и никто не пострадал. Позже из оконной рамы эксперты-криминалисты извлекли вещественное доказательство — деформированную дробину.

Мужчину задержали в квартире его сожительницы, а позже по месту жительства обнаружили и оружие. В отношении данного гражданина возбуждено уголовное дело по статье 339 часть 3 УК РБ (особо злостное хулиганство). Санкция статьи предусматривает лишение свободы сроком от 3 до 10 лет.

ЛЁСЫ ЛЮДСКІЯ

Аўдоліна доля

У старой Аўдолі Кузьмічонак стала прападаць памяць. Падыдзе да яе суседка Тэкля, паздароўкаецца, а ў адказ чуе: "Хто ета? Нешта не ведаю". Сын і пляменнік не кідалі яе, вазілі да доктара, але ніхто не мог даць рады. Ніякія таблеткі не дапамагалі. Мо перажытае за доўгія гады абрынулася на галаву нямоглай жанчыны? Мо прывіды мінулага замуцілі ёй карціну рэальнасці?

І было ад чаго, хаця лёс Аўдолі наўрад ці назавеш незвычайным — хутчэй ён характэрны, звычайны для лёсаў старэйшага пакалення, што прайшло дарогамі пакут і гора. У 1937-м ноччу "чорны воран" забраў яе мужа Андрэя, калгаснага брыгадзіра і сельскага актывіста, у чорную невядомасць. Дамоў ён не вярнуўся. (Толькі пасля смерці Сталіна Аўдоля атрымала паперку, што яе Андрэй рэабілітаваны, але пасмяротна...)

Адна гадавала траіх малых дзяцей. У вайну, у гады акупацыі, нацярпелася страху і бяды. Агонь спапяліў яе хату з усімі прыбудовамі, давялося мучыцца ў зямлянцы ля папялішча. Да глыбокай старасці, пры сагнутай спіне, карпела на калгасных палетках. Год за годам — і жыццё праляцела.

...Неяк на досвітку кароткага снежаньскага дня бабуля надзела ватоўку, павязала цёплую хустку, абула валёнкі і моўчкі выйшла з хаты. Апынулася на дарозе, што вяла да не блізкай, за пяць кіламетраў, вёскі Замошша. Амаль цэлы дзень няспешліва тупала па доўгай вуліцы туды-сюды. Ніхто, на жаль, не звяртаў на яе ўвагу. Яе вадзіла з боку ў бок. І ніхто не спытаў — скуль ты, бабуля, каго шукаеш? Палічылі — нейкая п'янчуга прыблудзіла. А тая прыцемкамі выйшла за вёску і скіравала свой крок да ўрочышча "Лапці" — колішняга балота. У дзяцінстве, застаўшыся без маці, Аўдоля разам з дванаццацігадовым братам Іванам і бацькам кожнае лета выязджалі ў тыя "Лапці" на сенажаць. Павяло бабулю да тых "Лапцяў", зараз прарэзаных на тры ці чатыры меліярацыйныя канавы. А ўжо падмарозіла, вада ў іх замерзла. Бабуля аступілася і звалілася ў канаву. Лёд хрснуў пад нагамі, і няшчасная апынулася з галавой у ледзяной вадзе. Яе шукалі, але не знайшлі. На другі дзень снег пакрыў усё шчыльным белым абрусам...

Толькі ўвесну, калі самалёт АН-2 сельгасавіяцыі пралятаў над тым урочышчам, каб рассеяць мінеральныя ўгнаенні, пілот заўважыў у канаве чалавечы труп. То была бабуля Аўдоля. Такой бядотнай была яе доля — ад пачатку і да канца. Яе пахавалі побач з магіламі маці і бацькі. За дамавінай моўчкі ішлі вяскоўцы, хто памятаў і любіў Аўдоліну добразычлівасць да людзей, гатоўнасць усім і кожнаму дапамагчы, хоць сваіх турботаў было вышэй галавы.

Міхась ТЫЧЫНА.

г.Слуцк.

ВАС ЦІКАВІЦЬ...

«Па ініцыятыве спартыўнай грамадскасці...»

У рэдакцыю патэлефанаваў чытач: "Неяк "Народная воля" пісала, што створаны Прэзідэнцкі спартыўны клуб, які ўзначаліў малодшы сын Аляксандра Лукашэнкі, Дзмітрый. Чуў, што клуб размяркоўвае нейкія стыпендыі, узнагароджвае спартсменаў, але хацелася б ведаць: адкуль ён наогул узяўся, гэты спартклуб, калі ў нас і без таго хапае спартыўных арганізацый? Ці, можа, яго спецыяльна стварылі, каб працаўладкаваць Дзмітрыя Лукашэнку?"

На сайце **Прэзідэнцкага спартыўнага клуба** напісана, што рашэнне стварыць рэспубліканскае дзяржаўна-грамадскае аб'яднанне "Прэзідэнцкі спартыўны клуб" было прынята "па ініцыятыве спартыўнай грамадскасці ўсіх абласцей Беларусі і горада Мінска". *"Беларускія спартсмены, ветэраны спорту, трэнеры, кіраўнікі і выкладчыкі спартыўных школ у ліпені 2005 года аб'ядналіся ў некамерцыйную арганізацыю, каб падтрымаць фізкультурна-аздараўленчы рух у краіне, — паведамляецца на сайце. — Сярод заснавальнікаў і сапраўдных членаў Прэзідэнцкага спартыўнага клуба імёны такіх выдатных дзеячаў беларускага спорту, як алімпійская чэмпіёнка ў спрынце Юлія Несцярэнка, чэмпіёнка свету па канькабежным спорце Анжаліка Кацюга, сярэбраны прызёр Алімпійскіх гульняў па боксе Віктар Зуеў... Клуб выступае надзейнай падтрымкай маладых перспектыўных спартсменаў і талантлівых трэнераў".*

Варта адзначыць, што ў клубе ў намесніках **Дзмітрыя Лукашэнкі**, акрамя спадара **Цярноўскага**, "ходзяць" старшыня Мінгарвыканкама **Міхаіл Паўлаў** і былы кіраўнік Службы бяспекі прэзідэнта, а цяпер старшыня УП "БФСО "Дынама-Спорт" **Юрый Бародзіч**. Акрамя таго, у цэнтральны савет уваходзіць яшчэ адзін сын Аляксандра Лукашэнкі — Віктар, а таксама **Віктар Варывончык, Марына Лобач, Аляксей Мінкін, Сяргей Сафар'ян і Юрый Чыж**.

Трэба сказаць, што за час свайго існавання Прэзідэнцкі спартыўны клуб на самай справе паўдзельнічаў ужо шмат у якіх мерапрыемствах — гэта і дабрачынныя акцыі для дзяцей, і міжнародныя спартыўныя спаборніцтвы, і ўзнагароджанні лепшых беларускіх спартсменаў года, і прысуджэнне стыпендый маладым перспектыўным спартсменам. Так што, як бачым, работа кіпіць. І грошы, відаць, ёсць, хоць арганізацыя і некамерцыйная.

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

ЗЕМЛЯКІ

Дызель Алены Чухнюк

З Гомельскага лакаматыўнага дэпо выйшаў на маршрут Гомель—Магілёў дызельны цягнік, названы ў гонар знакамітай жанчыны-машыніста Алены Чухнюк.

Алена Чухнюк нарадзілася ў Вінніцкай вобласці Украіны ў 1917 годзе. З 1934-га па 1946 год жыла і працавала ў Гомелі. У гісторыі Гомельскага лакаматыўнага дэпо А.Чухнюк была адзінай жанчынай-машыністам паравоза. Яна вадзіла цяжкавагавыя цягнікі ў Магілёў, Оршу, Чарнігаў. У гады вайны працавала машыністам на прыфрантавых участках чыгункі, дастаўляла вайсковыя цягнікі са зброяй і боепрыпасамі да лініі фронту. За асаблівыя заслугі ў 1943 годзе Алене Чухнюк было прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы.

Цяпер 90-гадовая Алена Міронаўна Чухнюк жыве ў Маскве. На ўрачыстасці ў Гомель не прыехала з прычыны ўзросту. Аднак Гомельскае аддзяленне Беларускай чыгункі дашле на адрас знакамітай жанчыны-машыніста фотаздымкі з урачыстасці ў лакаматыўным дэпо Гомеля.

Анатоль ГАТОЎЧЫЦ.

АКТУАЛЬНО

Выйти из сумрака

“Ночь. Улица. Фонарь. Аптека...” Аптекой в лучшем случае закончится путешествие пешехода в темное время суток через проезжую часть. И сколько раз твердили пешеходам, что вечером и ночью нужно стараться выделиться из темноты, а не стремиться слиться с окружающей средой, все эти советы не впрок! Спасением могло бы стать такое полезное изобретение, как фликеры. Законодательством закреплено, что светоотражающими элементами должны быть “украшены” и велосипеды, и телеги, и пешеходы, которые выбираются из дому после захода солнца. Особенно, если они собираются идти по проселочным дорогам. Самые разные виды фликеров сейчас есть в продаже — нашивки, наклейки, повязки, кулончики. Однако выяснилось, что большинство предпочитающих прогулки в радиусе наезда, не знают, что такое фликер и “с чем его едят”...

*За разъяснениями мы обратились в отдел пропаганды и агитации УГАИ МВД Беларуси к **Анне БАНАДЫК**.*

— Анна Эдвардовна, прежде всего расскажите, пожалуйста, что такое фликер?

— Фликер — это запатентованное название световозвращающих элементов и только их. Поэтому говорить обо всех элементах, которые возвращают или отражают свет, так нельзя. У нас по всем ГОСТам проходит название: *“световозвращающая продукция”*.

— И как она действует?

— Пешеход в темное время суток в темной одежде виден водителю в ближнем свете фар не больше, чем за 30 метров, а эти 30 метров даже на скорости 60 километров в час водитель проезжает за 2 секунды — то есть он даже не успевает увидеть пешехода, не говоря уже о том, чтобы затормозить или объехать его. Поэтому и происходят наезды на людей. Проблема заключается в том, что пешеход думает, что он виден водителю в свете фар. Но это не так. А световозвращатели помогают человеку светиться на большом расстоянии: делают его видимым на расстоянии в 140 метров в ближнем свете и около 400 метров в дальнем свете. За эти 140 метров у пешехода появляется реальная возможность спастись — водитель его увидит, посигналит ему, объедет или вообще затормозит, чтобы не совершить наезд. Ведь гибель и травматизм пешеходов — самая главная проблема ГАИ.

— Неужели люди настолько пренебрегают своей безопасностью?

— К сожалению, да. Статистика ужасает! По результатам прошлого года самое большое количество происшествий — 43 процента — произошли именно с участием пешеходов.

Для сравнения: в европейских странах травматизм пешеходов в процентах за год составляет от 10 до 12. И это максимум.

Потому требование надевать световозвращающие элементы при движении в темное время суток по краю проезжей части у нас не так давно было закреплено в Правилах дорожного движения.

— Как ГАИ осуществляет внедрение новых средств безопасности?

— Мы переняли норвежский опыт, где используются съемные световозвращающие элементы в виде значков, повязок, браслетов и кулонов, и начали распространение и рекламу таких элементов. Для начала мы раздавали их бесплатно. Так, например, проводилась совместная с МТС акция. Компания заказала нам 50 тысяч световозвращающих значков, мы расписали эту акцию по всей республике. Приходили в школу с ростовой куклой в виде большого телефона, устраивали спектакли и игры для детей и в такой легкой форме рассказывали им, как и зачем носятся фликеры, а потом раздавали их всем детям. И только в 2006 году таким образом мы раздали 90 тысяч световозвращающих элементов бесплатно.

Но... Например, недавно был случай, когда папа, несший на руках годовалого ребенка, переходил дорогу, в нетрезвом состоянии. Их сбила машина, ребенок погиб.

Также люди не умеют (!) носить световозвращатели. Детям вешают на рюкзак, хотя по правилам они должны ходить напротив движения транспорта. И если уж крепить фликеры на рюкзак, то нужно не клеить, а именно вешать его, чтобы он болтался и светился со всех сторон.

Взрослым фликеры также необходимы. Например, мужчина переходил дорогу, и у него была световозвращающая повязка, но он шел с женой под ручку, и от этой повязки не было никакого толку, потому что она была скрыта рукавом...

— Сейчас МВД требует, чтобы предприятия легкой промышленности выпускали верхнюю одежду со вставками из светоотражающей ткани...

— Да, мы полагаем, что проблему ДТП в темное время суток с участием пешеходов решит вшивание световозвращающей ленты в одежду — так, как это делается у зарубежных производителей. Ведь даже во всех китайских комбинезончиках, курточках, штанишках есть световозвращающие вставки. У нас же, к сожалению, несмотря на все рекомендации, мало кто производит такие вещи, а если и производят, то очень маленькими партиями. Кроме того, в основном это идет трикотаж — то, что носится под верхнюю одежду, хотя световозвращатели должны быть на виду.

В указе президента, которым утверждены новые Правила дорожного движения, было распоряжение наладить массовое производство световых элементов. Но у нас, к сожалению, этого массового производства нет. Такие элементы производит только могилевская “Лента”, и то по коэффициенту световозвращения она уступает зарубежным аналогам. Все остальное завозится из Китая, России и Польши.

Мы обратились в “Белкоопсоюз”, чтобы наладить массовую продажу этих элементов, чтобы выделили торговые площади, чтобы была соответствующая реклама. Но все это нам пришлось взять на себя. Получается, что только мы заинтересованы в сохранении человеческой жизни...

— А почему “Беллегпром” не поддерживает эту инициативу?

— Я, честно говоря, даже не знаю... Наверное, потому что тот же председатель колхоза не думает о том, что у него ежегодно давят двух человек, которые в темноте идут на ферму рано утром и с фермы поздно вечером. Он не думает, что теряет рабочую силу, что на селе — демографический кризис... Постепенно мы все-таки стараемся доносить важность световозвращающей самозащиты до сознания людей. И, к счастью, уже все больше обращается на эту проблему внимания...

Ольга ПРУДНИКОВА.

ЕСТЬ МНЕНИЕ

Елена ЦОКОЛЕНКО, модельер:

— Носить или не носить “светящуюся” одежду — каждый решает сам. Все зависит от образа жизни, который ведет человек, от того, для чего предназначена данная одежда. Мне, например, нет надобности в этом. Но если люди живут за городом, то, думаю, они должны иметь в своем гардеробе “светящуюся” одежду. По крайней мере, для такого времени года, как сейчас.

Мне кажется, что фликеры более уместны в детском гардеробе, нежели во взрослом. Просто для меня важна, конечно же, и эстетическая сторона одежды, а не только функциональная. Я считаю, что одежда с такими вставками будет всегда немного напоминать спецодежду. Поэтому я в данном случае выступаю скорее за какие-то съемные детали. Значки ведь необязательно вшивать в одежду. Хотя... Неоновые цвета и оттенки сейчас вновь актуальны.

Вера ПАШКОВСКАЯ, хозяйка ателье “Андарак”:

— Фликеры — это не совсем нововведение, оно часто использовалось и раньше, только в основном как элемент спортивной и рабочей одежды, а сейчас это просто стало больше распространено. Иногда модельеры использовали световозвращающую ленту как элемент дизайна, в качестве какого-то украшения.

Я считаю, что световозвращающие элементы можно и нужно делать красивыми. Главное — подумать, как все это обыграть, чтобы было не казенно, не однотипно, не похоже на одежду работников ГАИ или строителей. Кроме того, иногда можно использовать эти ленты или значки в ремонте одежды. Мы очень часто предлагаем нашим клиентам в качестве выхода из положения, когда вещь порвалась, нашивку световозвращателей: и возвращенная к жизни вещь, и элемент безопасности.

А как дизайнер, я, например, использовала бы световозвращающую ленту, чтобы акцентировать внимание на какой-нибудь детали изделия. Причем использовала ее с самыми разными материалами: джинс, мех и даже кружева. Это вопрос фантазии — куда и в каком виде употребить, чтобы людям хотелось носить такие вещи.

Странно, что белорусские предприятия не поддерживают подобную инициативу. Ведь это хорошо — нет простоя, прекрасная возможность работать и фантазировать для модельеров. Может быть, это профессиональная инфантильность, неумение или нежелание немного перестроить производство? А может, они забыли, что в XXI веке живут, что нужно мобильно реагировать на изменения и требования жизни?..

КСТАТИ

Целый месяц инспектора предупреждали об изменениях в новых Правилах дорожного движения. Но время уговоров прошло, пора наказывать рублем! Ведь для многих автомобилистов новые ПДД будто неписаны. Они по-прежнему носятся по крайней правой на дороге с тремя полосами в одном направлении, опережая другие машины. Забывают пристегиваться ремнями безопасности и как ни в чем не бывало болтают за рулем по мобильнику. А во дворах по ночам, как и раньше, перекрикивают друг друга неисправные сигнализации. Словно ничего и не изменилось с 1 января...

Отныне придется раскошелиться всем нарушителям. Но в первую очередь инспектора ГАИ накажут рублем водителей общественного транспорта, лавирующих в потоке с полосы на полосу. “Заплутавших” шоферов оштрафуют на сумму от 0,3 до 2 базовых величин. Сейчас инспектора предупреждают об изменениях автобусные и троллейбусные парки, автомобильные предприятия. Для водителей проводятся лекции.

А новые штрафы водители начнут платить с 1 марта.

ТЭНІС

Хто стане «тэнісным» рэктарам?

Упершыню за ўвесь час выступлення беларускіх тэнісістаў у Мінску ў межах Кубка Дэвіса “Народную волю” на мерапрыемства не акрэдытавалі. Прэс-аташэ Нацыянальнага алімпійскага камітэта толькі разгублена паведаміў, што прозвішчаў нашых журналістаў у зацверджаных недзе наверсе спісах проста няма...

Пры гэтым ён ветліва параіў глядзець трансляцыі па тэлебачанні...

...Вызваліўшы рукі ад чырвона-зялёнага сцяжка і ўсунуўшы яго ў нагрудную кішэню пінжака, Аляксандр Лукашэнка з дзіцячым азартам пляскаў у далоні. Гэтую карціну маглі назіраць усе, хто быў у футбольным манежы альбо назіраў тэнісныя трансляцыі па тэлебачанні. Але запал беларускага кіраўніка не дапамог Мірнаму і Валчкову адолець шведаў. З пачатку новага года ў беларускага кіраўніка, трэба сказаць, са спортам не складваецца — расіянам у хакей ягоная каманда прайграла, прысутнасць на тэнісным матчы Беларусь—Швецыя нашым не дапамагла...

Многія задаваліся пытаннем, што ж за прыгожая дзяўчына сядзела побач з Лукашэнкам і жвава абмяркоўвала перыпетыі паядынку. З дасведчаных крыніц стала вядома, што гэта юная беларуская тэнісістка Ганна Орлік. Ходзяць чуткі аб тым, што кіраўнік дзяржавы спецыяльна дамовіўся аб сустрэчы з ёю... Зразумела, на корце. Астатніх беларускіх чыноўнікаў можна было пашкадаваць. Пасля таго, як Мірны саступіў і вынік сустрэчы быў вырашаны, яны, можа, і хацелі б пайсці дамоў да сем’яў (усё ж такі была нядзеля)... Але ніяк не маглі пакінуць футбольны манеж з-за прысутнасці ў ім Лукашэнкі, які застаўся назіраць за нічога не вырашаючым матчам з удзелам Уладзіміра Валчкова.

Пасля заканчэння матчу (а можа, і раней) беларускі кіраўнік вырашыў: у Беларусі павінна быць тэнісная акадэмія. Кіраўнік Мінгарвыканкама Міхаіл Паўлаў, які па сумяшчальніцтве з’яўляецца кіраўніком беларускай тэнісной асацыяцыі, паведаміў, што даручэнне будзе выканана ўжо ў бягучым годзе. Прычым кіраўнік краіны выказаў спадзяванне, што ўзначаліць яе можа нехта з цяперашніх членаў беларускай зборнай. Намёк яўна быў у бок Уладзіміра Валчкова, які некалі заяўляў, што збіраецца ў хуткім часе завяршыць кар’еру. Аднак сам Уладзімір лічыць, што гэтая пасада — не для яго. Маўляў, ён яшчэ карысны Беларусі як дзеючы спартсмен. Так што месца рэктара тэнісной акадэміі застаецца вакантным. Пакуль...

Антон ВІТАЛЬЕЎ.

СПАРТЫЎНАЯ МАЗАІКА

Рыхтуй лыжаролеры зімой

У Мінску па праспекце Пераможцаў пабудавана лыжаролерная траса.

Як паведаміў начальнік аргмасавага аддзела ўпраўлення па фізічнай культуры і спорце Мінгарвыканкама Васіль Касач, траса працягласцю 5 кіламетраў будзе выкарыстоўвацца як для правядзення прафесійных спаборніцтваў, так і для аматарскіх трэніровак.

На каго Бог пашле?

Беларусь займае 29-ы радок у рэйтынгу Fair Play, які дае права на дадатковую пуцёўку ў першы адборачны раунд Кубка УЕФА.

Лідзіруе на гэты момант з каэфіцыентам 8,258 Швецыя, на другім радку — Нарвегія, на трэцім — Данія.

Зараз галоўнымі прэтэндэнтамі на дадатковую пуцёўку ў Кубак УЕФА з’яўляюцца шведы, якія ў мінулым годзе таксама першынствавалі ў гэтай намінацыі. Аднак падвядзенне афіцыйных вынікаў адбудзецца толькі 30 красавіка 2007 года.

Дарэчы, пуцёўкі атрымае не толькі пераможца рэйтынгу Fair Play сезона 2006/2007 — два астатнія пропускі будуць разыграны жараб’ёўкай. Прэтэндэнтамі будуць тыя асацыяцыі, чый каэфіцыент перавысіць 8 балаў.

Майстар

Міхасю Стральцову — 70

“Блакітны вецер” — гэтак Міхась Стральцоў назваў сваю першую кнігу. Кніжачку? Памер — дзіцячая далонька. І за далонь дзіцяці танчэйшая. І вокладка — шматок паперы. Але ж — кніга.

“Дома” — першае апавяданне ў першай кнізе.

Год — 1962.

Той год я памятаю, між іншага, дарогай з Мінска ў Крычаў, дадому, як у вагоне прыгараднага цягніка, ад Оршы да Крычава, чытаў Стральцова “Дома”.

Першы радок памятаю і цяпер:

“Доўгім і вузкім дваром яны дайшлі да пуні”.

А далей з кнігі, хоць тры радкі:

“Сцяпан зняў з прабоя клямку, і вароты са скрыпам расчыніліся. З пуні патыхнула моцным, такім знаёмым Сцяпану пахам сырой зямлі і свежага сена. Ён дастаў з кішэні карабок і асцярожна чыркнуў запалкай”.

У той час я захапляўся Іванам Буніным. Якраз, крыху раней, выйшла першая для нас, савецкіх чытачоў, кніга яго апавяданняў і яна шмат год ляжала на маім пісьмовым стале. Бывала, сядзеш за стол, Буніна разгорнеш, старонку прачытаеш: Божа, як усё на месцы — слова, гук, пах, рух, водар, настрой. А як вярнуўся з Мінска, на стол да Буніна лёг і “Блакітны вецер”. Чытаў Стральцова і думаў — сябе не раз лавіў на гэтым — якая ўсюды, у кожным слове і паміж слоў, дакладнасць і паўната, як у Буніна.

Праз дваццаць пяць гадоў, узяўшы новае выданне Стральцова, ужо выбранае, я захацеў убачыць, як ён, на схіле свайго нядоўгага жыцця, рыхтуючы перавыданне ранніх твораў, іх перачытваў, рэдагаваў, ці шмат сябе самога, маладога, правіў, як звычайна робяць у літаратуры, бо гэта натуральна, сваё палепшыць з вышыні творчага ды жыццёвага вопыту, новых адчуванняў. Параўнанне тэкстаў апавядання “Дома”, першага выдання і апошняга, падрыхтаванага аўтарам, здзівіла: ні слова перайначанага ці выкінутага. Падумалася: што гэта? Творчы прынцып? Але гэтую думку адвяргалі нязначныя папраўкі ў іншых творах, дзе ў той жа час быў поўны давер першаму тэксту. Загадак няма. Міхась Стральцоў прыйшоў у літаратуру адразу безумоўным майстрам. А гэта — з’ява надзвычай рэдкая.

Лёс майстра не бывае лёгкі. Не толькі ў сэнсе самаахвярнасці і абавязку. Яму наканавана зайздрасць акружэння. У Моцарта заўсёды ёсць Сальеры. Былі Сальеры і ў Стральцова. Нават з вядомых паэтаў і празаікаў. Але яго майстэрства ніхто ніколі не мог аспрэчыць. Нават і сам Стральцоў — сам над сабой рэдактар.

У праграмным вершы “Размова з часам” ён выкажацца:

Мой голас у веку наступным пачуецца.

І не памыліцца.

Але, перачытваючы яго ў гэтым новым XXI веку, да якога ён не дажыў, мы задумваемся над загадкаю майстэрства Стральцова, як сам некалі думаў, і думы свае пакінуў нам, над загадкаю Максіма Багдановіча. І тут кожны з нас, яго чытачоў, мае права на свае разгадкі гэтай прыгожай загадкі.

Калі маўчыць душа, гібее розум наш, —

засцерагае ён у вершы “Засцярога” ад забыцця, што першае — душа і пачуццё. Не слова і не думка — душа і пачуццё. Што слова, думка, адзіныя, якіх паэт чакае, знойдуцца, калі душа працуе, не спіць, калі яна не хлуслівая, калі ў ёй гарыць святло, пануе чысціня. Ён усё жыццё рупіўся пра чысціню душы, бярог яе ад лжы і бруду. Да самаахвярнасці. Рэальнасць, у якой ён жыў, гарантый не давала. І гэта яго хвалявала, засмучала, трывожыла, прымушала маўчаць. Адзіным ратункам была повязь з роднай вёскаю, са сваім маленствам. Пагэтаму так часта ў творах ён туды вяртаецца. Там, дома, яго душа. І гэтыя творы — лепшыя ў Стральцова: “Дома”, “Адзін лапаць, адзін чунь”, “На чацвёртым годзе вайны”, “Смаленне вепрука”, шмат якія вершы, сярод якіх і гэты:

Хачу я з тым, з маленства хлапчуком,
Свае гады ў дарозе пераняўшы,
Спаткацца...

Там бачыў свой ратунак — у родным Сычыне. І адчуваў, асабліва пасля таго, як Сычын апынуўся ў радыяцыйнай зоне, што яго родная планета плыве з-пад ног. Дзе выйсце для душы? У сустрэчы са сваім хлопчыкам — сваім маленствам?

Хачу пабачыць толькі той пагляд,
Яго пагляд, — я помню, быў ён сіні.

А далей што?

І ўсё, і ўсё. Сагрэцца б толькі ім.
Цяпер бывай, — пара і развітацца.
І больш нічога.

Бо —

Захад стаў як дым.
Залеглі цені. Стала нанач бракца.

А далей ужо тое, што ён сказаў у “Засцярозе”:

Калі душа маўчыць, не гаварыце лепш.

Сказаў — перасцярог усіх.

Сказаў сабе таксама.

І замаўчаў. Быў век XX.

Век XXI — чытаем Міхася Стральцова.

Віктар КАРАМАЗАЎ.

ГАЗЕТА — ЧЫТАЧЫ

У сакавіку — з «Народнай воляй»!

Хто не зрабіў **перадаплату** за сакавіцкія нумары, зрабіце гэта, калі ласка ў бліжэйшыя дні. Дзеля гэтага мы і друкуем сёння ўзоры плацежкі і абаненцкай карткі.

Для тых, хто толькі-толькі вырашыў стаць чытачом “Народнай волі”, паведамляем: каб зрабіць **перадаплату** за нумары наступных месяцаў (можна нават да канца паўгоддзя), **тэрмінова** наведайце любы філіял “Беларусбанка”, а там, дзе іх няма, — любое паштовае аддзяленне. Мінчане могуць аператыўна зрабіць **перадаплату** праз рэдакцыйны офіс (вул.Энгельса, 34а) альбо пазваніць па тэлефонах: 206-63-93 ці 206-68-71. Пасля званка да Вас прыйдуць нашыя валанцёры з новымі нумарамі газеты і дапамогуць аформіць **перадаплату** за любы тэрмін.

Нагадваем: сума **перадаплаты** за месяц ранейшая — **9500** рублёў для індывідуальных чытачоў і **15.000** рублёў для арганізацый, прадпрыемстваў, устаноў, фірм (за два месяцы адпаведна 19.000 і 30.000 рублёў). Банкаўскія рэквізіты “Народнай волі” такія:

УП “Народная воля”: р/р 3012006535014, ААТ “Пріорбанк”, ЦБП 113, код 749, УНН 100961759.

У чарговы раз звяртаем увагу на тое, што перасылаць у рэдакцыю трэба не толькі копію плацежнага дакумента, але і запоўненую **АБАНЕНЦКУЮ КАРТКУ,** узор якой друкуем і ў сённяшнім нумары. Зноў жа: запаўняйце выразна, пажадана друкаванымі літарамі. Разумеем: для Вас, шаноўныя чытачы, гэта дадатковыя цяжкасці. Але што зробіш: каб Вы своечасова атрымлівалі газету, мы вымушаны звяртацца з такой просьбай.

Вы — з «Народнай воляй», «Народная воля» — з Вамі!

0402280179

ИЗВЕЩЕНИЕ

ИЧУП «Народная воля»
получатель платежа
«Приорбанк» ОАО ЦБУ 113 г.Минск
наименование банка
Счет получателя 3012006535014 Лицевой счет код 749
УНН* 100961759
(фамилия, имя, отчество, адрес)

Вид платежа			Дата	Сумма
Предоплата за февраль, март, апрель, май, июнь 2007 г. (ненужное зачеркнуть)				
Плательщик			Пеня	
			Всего	

Кассир

ИЧУП «Народная воля»
получатель платежа
«Приорбанк» ОАО ЦБУ 113 г.Минск
наименование банка
Счет получателя 3012006535014 Лицевой счет код 749
УНН* 100961759
(фамилия, имя, отчество, адрес)

Вид платежа			Дата	Сумма
Предоплата за февраль, март, апрель, май, июнь 2007 г. (ненужное зачеркнуть)				
Плательщик			Пеня	
			Всего	

КВИТАНЦИЯ

Кассир М.П.

* Заполняется только при осуществлении операции по уплате налогов

Абонентская карточка

на номера газеты «Народная воля»
за февраль, март, апрель, май, июнь 2007 года
(ненужное зачеркнуть)

*Заполняется отчетливо **печатными буквами** и **обязательно** отправляется в редакцию с **копией платежного документа***

фамилия
имя **отч.**
индекс почтового отделения
область
район
название населенного пункта
город, городской поселок, поселок, деревня (нужное — подчеркнуть)
улица пр-т переулок *(нужное — подчеркнуть)*
дом *а,б,в,г* **корп.** **кв.**

(Примечание: в случае получения газеты через абонентский ящик обязательно укажите индекс и адрес почтового отделения)

Адрас рэдакцыі:
220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная: тэл./факс (017) 206-68-71.
Тэл./факс рэкламнага аддзела: 206-69-04, 206-69-06.
E-mail : nv@promedia.by
http://www.nv-online.info
Індэкс 63222

Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф СЯРЭДЗІЧ

У сувязі з адсутнасцю магчымасці рэдакцыя матэрыялы не рэцэнзуе і не вяртае, права ўступлення ў перапіску пакідае за сабой. За інфармацыю, размешчаную ў рэкламных аб'явах, рэдакцыя не адказвае. Могуць друкавацца матэрыялы, у якіх пазіцыя аўтараў не падзяляецца газетай.
Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №246 ад 10 кастрычніка 1996 г. (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.).
Надрукавана ў ТАА "Типография Михайлова - С", 214020, г.Смаленск, вул. Шаўчэнкі, 86. Па заказе ТАА "Типография Михайлова", 214000, г.Смаленск, вул. Кастрычніцкай рэвалюцыі, д.38, кв.54. Падпісаны ў друк 14.02.2007 у 16.00. Аб'ём 4 друк. аркушы. Тыраж: 11 000 экз. Заказ №